ТАРАС ГУШЧА
(ЯКУБ КОЛАС)

НА РУБЯЖЫ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК 1925

Б. Д. В. № 23. Галоўліт № 3789.

Друк. Профтэхшколы. Заказ № 265 Гіз. У ліку 3.000 экз.

СЯРГЕЙ КАРАГА

Цёплая летняя ноч павольна апускалася на зямлю і ўсё гусьцей і гусьцей цярушыла над ёю, як-бы прасяючы скрозь танчэйшае сіта малюпасенькія крупінкі мроку. Рэзка вызначаныя абрысы лясоў і ўзгоркаў трацілі сваю форму і зьнікалі ў гэтым мроку. Летняе неба, здавалася, ніжэй зьвесілася над зямлёю і ўзіралася ў яе тысячамі бліскучых вачэй. Але на зямлі ў гэты момант было пуста й ціха,—так ціха, што ад гэтае цішыні патыхала нейкаю жудкасьцю, бо яна, гэтая цішыня, была так нязвычайна, так няпрывычна. І небу, як відаць, не хацелася паверыць, што там, на зямлі, і запраўды спакойна, бо яно зараз-жа выслала з-за цёмнага краю зямлі яшчэ аднаго дазорцу—крывава-чырвоны, сьцяты баханец-месячык. Чуць падняўшыся над дубоваю кудзеркаю лесу, што стаяла па той бок Псла, крыху павесялеўшы месячык зараз-жа нырнуў у хмарку. Відаць, гэта проста была яго ваяцкая хітрасьць, і гэтую хітрасьць запазычыў ён ад людзей, бо ў гэтым месцы зямлі яны якраз ваявалі. І чуць толькі закрыў ён свой твар у цёмнай хмарцы, як у гэты-ж момант адтуль, з-пад кудзеркі дубовага лесу, гукнула гармата. Глуха здрыганулася цёмнае паветра, і водгульле-гром пакацілася па Пслу, па глыбокіх ярох, як грознае суладзьдзе хору віхроў.

—А, такі адгукнуўся,—ціха прамовіў Сяргей Карага, і яму стала чамусь весялей.

Чаму?

Ён проста не задумваўся над гэтым пытаньнем, але ў яго цяпер было такое пачуваньне, што ён не адзін, што дзесь там—таксама ёсьць людзі. Праўда, тыя людзі—заклятыя ворагі яго! Ён ведае, што там позыцыі карнілаўскіх палкоў, самых заядлых, самых заўзятых і самых моцных з усяе дзянікінскае армады.

З другога-ж боку, гэты самы гук, драпежны й злосны, памагаў яму крыху аглядзецца і больш-менш пэўна вызначыць сваё палажэньне, бо ён заблутаўся ў незнаёмай мясцовасьці, згубіў сувязь з сваёю разьведкаю і колькі гадзін блукаў па гэтых дзікіх ярох, заросшых грушамі-самасейкамі і купчастымі буйнымі кустамі маладога дубняку. Гэта блутаніна была так няпрыемна, а горш усяго гэта глуш, гэтае бязьлюдзьдзе і гэтае чаканьне на кожным кроку небясьпекі.

Ён прысеў на росную мяжу пад кустом быльняку. Вакол ляжала маўклівае пустое поле.

Сяргей Карага стаў узірацца ў тое месца, адкуль толькі што грымнула гармата.

Сьледам за першым гукам блiснула зарніца.

„Раз, два, тры, чатыры, пяць“,.. пачаў ён лічыць хвілінкі, каб па іх вызначыць адлегласьць да таго месца, адкуль стралялі гарматы.

Як толькі ён налічыў „дваццаць адзін“, пачуўся другі стрэл, больш густы і моцны.

„Шэсьць з палавінаю вёрст“—вылічыў Сяргей Карага і пачаў штось вырахоўваць, як чалавек, добра знаёмы з вайсковаю абстаноўкаю. Вынікам усяго гэтага вырахаваньня было заключэньне, што тут дзесь недалёка павінны быць дзянікінскія дазорцы.

Сяргей Карага ніжэй прынік да зямлі і стаў аглядаць месца. Перш за ўсё ён зьвярнуў увагу на тое, што ён сядзіць на самым высокім месцы поля і можа, дзякуючы гэтаму, добра адбівацца на сьветлым небе, калі пазіраць на гэты ўзгорак з нізоў.

Яшчэ больш пасьвятлеўшы месячык ізноў выплыў з-за хмаркі. Пужліва-варожы мрок крыху расступіўся, парадзеў, і

перад Сяргеем Карагаю вызначылася цёмная палоска—шляк яру. У гэты момант вочы яго мімавольна, як-бы самі глянулі ўперад. Па целе маладога разьведчыка прабегла дрыготка: ня больш, як у сту кроках ад яго, як-бы з зямлі вырасьлі тры цені.

„А можа гэта бур'яны?..“

Карага не дадумаў да канца свае думкі: гэта прадпалажэньне аказалася памылковым у той момант, калі белаватасіні водблеск месяца сьлізгануў па стальным сьцябле аднаго з гэтых „бур'янаў“.

Ясна, што гэта дазорцы, і таксама было ясна, што гэта—дазорцы дзянікінскія.

„Замецілі яны мяне, ці не?“

Сьвідравала мозг гэтая страшная думка, і ў той-ж час у галаве яго борзда, борзда складаўся плян дзеяньня. У момант зьмерыў ён вачыма адлегласьць да яру.

„Эх, дапаўзьці-б да кустоў, дабрацца-б да яру“, была цяпер у яго толькі гэта адна думка. Аб тым, што будзе там далей, Карага цяпер ня думаў. Але яр быў шмат далей, чым гэтыя тры фігуры, якія паволі, бяз шуму ішлі якраз на яго.

„Замецілі, замецілі, сволачы!..“

Паварушыцца ў гэту мінуту Карага лічыў сьмяртэльнаю небясьпекаю. Ён прыліп да мяжы, як-бы сама зямля трымала яго сваімі моцнымі рукамі.

Ён рашыў сядзець моўчкі, бо ў яго была ўсё-ж такі надзея, што яны яго ня бачаць.

А калі ўжо прыдзецца так, што дзявацца будзе некуды, тады...

Карага моцна сьціснуў у руках сваю вінтоўку. Цяпер яна адна-аднютка ў цэлым сьвеце, хто можа за яго заступіцца і пастаяць. Аддавацца-ж жывым Карага ня думаў, бо там верная сьмерць і зьверскія кпіны.

І ў яго галаве вынікнуў цэлы клубок уражаньняў гэтага дня: час выхаду на разьведку, школа, дзе застанавіўся штаб іх палка, таварышы і нейкія абрыўкі-зьявы нядаўна-мінулага ваяцкага жыцьця,—усё гэта вынікла ў адзін момант, як-бы

прад яго вачыма на міг вывесілі нейкі многавобразны, але пераблутаны малюнак. І яшчэ адна зьява, што так глыбока запала ў душу Сяргея і так моцна ўскалыхнула яе,—гэта сьмерць камандзіра іх батарэі. Яна, дапраўды, варта таго, каб яе адзначыць.

Бой, што называецца, кіпеў. Адны рады байцоў скошваліся, іх месца заступалі новыя і новыя рады-ланцугі.

Дзянікінцы лезьлі назойліва, лезьлі ўпарта, як раненыя драпежныя зьвяры, і нічога не магло іх стрымаць, бо тая позыцыя, якую займалі чырвоныя, была нязвычайна важна.

Батарэя, якою камандваў быўшы афіцэр, штабс-капітан Ваганаў,—чалавек нязвычайнае моцы душы, пустошыла рады насядаўшых дзянікінцаў. Сюды, на гэту батарэю, быў наведзен агонь трох бранявікоў і палявое батарэі. Але Ваганаў так умеў паставіць свае гарматы і так спрытна мяняў іх месцы, што агонь праціўнікаў не рабіў ніякае шкоды. К рашучаму моманту бою былі растрэлены ўсе снарады, і гэта батарэя была прымушана змоўкнуць.

— Братцы!—сказаў тады Ваганаў салдатам:—цяпер тут няма чаго рабіць. Трэба выратаваць гарматы!

Але дзянікінцы былі ўжо блізка і некалі было вывозіць гарматы. Перапалоханыя чырвонаармейцы кінуліся наўцекі.

— Прашчайце, таварышы!—гукнуў ім Ваганаў, а сам сеў на гарачае яшчэ цела гарматы.

Сеў, выняў партабак і закурыў. Сядзіць спакойна, аб чымсі думае і пускае тонкія клубочкі сіняватага дыму. Разьяраныя афіцэры-карнілаўцы ўварваліся на батарэю. Бачаць—на гармаце камандзір сядзіць, курыць, кудысь у прасторы глядзіць і іх не прымячае.

— Вы—камандзір батарэі?

— Я,—спакойна адказвае той.

— Вы прымушаны былі так метка страляць, ці вы гэта рабілі ад чыстага сэрца?—злосьмешна запытаў карнілавец.

— Мяне ніхто ня можа прымусіць, калі я гэтага не захачу сам,—чаканячы кожнае слова, прамовіў Ваганаў.

— Ты—комуністы?—ужо груба і злосна прамовіў паручык-карнілавец.

— Я—салдат Чырвонай арміі.

— Чаму-ж не ўцякаў ты, жыдоўскі найміч, разам са сваім збродам?

— Прашу быць вежлівым! Я з вамі на грабяжы не хадзіў, гэта раз! А другое—я хацеў паказаць яшчэ нястойкім салдатам Чырвонае арміі, як павінен уміраць чэсны салдат.

— Зраднік!..

Паручык-карнілавец выхваціў шаблю й са ўсяго размаху сékануў яго па галаве. Падскочылі другія карнілаўцы. Абліты крывёю Ваганаў бяз слова, бяз зыку асунуўся пад калёсы гарматы.

Вось гэты вобраз штабс-капітана Ваганава й яго сьмерць канязвычайна яскрава ўявіліся цяпер перад вачыма Сяргея Карагі і паддалі сілы яго духу.

Ён пачаў разважаць больш спакойна.

Адвёўшы на момант свае вочы ў бок яру, а гэты яр, тым ня меней, усё больш і больш займаў думкі Сяргея Карагі,—ён зноў зірнуў перад сабою... Што за чартоўшчына: перад ім нікагутка ня было.

„Што за праява?“ падумаў Сяргей і пачуў, як па яго сьпіне захадзілі мурашкі. „Напэўна замысьлілі штось і, відаць, палеглі на зямлю“. Усё цела яго сажмалася; ён пачуў боль з боку лба, як-бы ў гэта месца вось-вось паляціць куля, бо Сяргей чакаў, што ў яго пачнуць страляць. Але момант прашоў і нічога такога ня здарылася.

— Куды-ж яны дзеліся?—круціў галаву Сяргей, і нейкі невядомы страх агарнуў яго душу. Ён пачуў, што ня можа больш аставацца тут. „Трэба прабірацца к яру“,—і яго вочы йзноў пазіралі на яр. Ён ціхенька ссунуўся з мяжы ў разору.

„А слаўная разорка!“ падумаў Сяргей.

Над гэтаю разоркаю якраз выступала досыць высокая мяжа, абросшая травою, і такім чынам рабіла яго незаметным. І ён папоўз,—папоўз ціха, лоўка, як вуж, як-бы паўзуном ён і на сьвет радзіўся. Крыху замінала вінтоўка, але скора

прыстасаваўся паўзьці і з вінтоўкаю. Адпоўзшыся колькі крокаў, ён спыняўся, аглядваўся, прыслухваўся.

Палавіну разоры ён ужо прасунуўся. Жаданы яр ужо недалёка. Ён прапоўз яшчэ крокаў сорак. Разора кончылася. Перад ім быў голы ўзгорак, а па гэтым узгорку ішла дарога каля яру.

„Вось гэта ўжо горай!“ Ён яшчэ раз азірнуўся й папоўз на дарогу.

— Стой! хто?

Сяргей так і абамлеў: каля яру, крокаў пяцьдзесят ад яго, хадзіў часавы і аклікаў яго. І не пасьпеў Сяргей зрабіць і аднаго руху, як на яго ззаду навалілася нейчае, як дуб, крэпкае цела, і жалезныя рукі, як абцугі, здушылі яму плечы і рукі.

— Хто?—ізноў крыкнуў часавы.

— Не страляць, Ягадкін! Бягай сюды!—хрыпла крычаў невядомы і мацней сьціскаў Карагу. Між імі пачалася барацьба. Сяргей таксама быў нязвычайна крэпкі хлопец. У вадзін момант ускінуў ён плячыма і перавярнуўся тварам к свайму сьмяртэльнаму ворагу, стараючыся вызваліць рукі. Ён адпіхаў яго нагамі, гатовы рваць і грызьці свайго ворага.

— Не, дудкі, ня выкруцішся, брат!—хрыпеў гэты вораг.

Колькі хвілін, зьвіўшыся ў клубок, качаліся яны па зямлі, але жалезныя рукі, так нагла напаўшага праціўніка, не слабелі і здушвалі ўсё крапчэй.

Падбег часавы, сюды-ж зьбягаліся яшчэ салдаты.

— Здаравецкі, сукін сын, як бык! чуць-чуць нявырваўся,— казаў дзянікінскі старшы унцер-афіцэр, трымаючы Карагу.

— Круці і зьвязвай яму рукі!

—Эх, вы, салдаты, салдаты! На ляжачага напалі, гуртом набеглі, ды яшчэ рукі зьвязваеце,—з насьмешкаю прамовіў Сяргей.

— Так, брат, будзе спакайней,—адказаў салдат, скручваючы рэменем яму рукі.

— Ты надта, брат, спрыцен, ня ў прыклад другім чырвоным. Ці ня будзеш ты часамі комуністы? Давай свае кішэні!—з нядобрым сьмехам казаў унцер-афіцэр.

„Прапала, усё прапала,“ думаў Сяргей Карага: „і так падурному, так неразумна папаўся!“

Сяргей Карага ведаў, як ветла тут сустракаюць комуністых і быў асьцярожным: усё, што магло так ці йначай давясьці, што ён комуністы, ён зьніштожыў яшчэ загадзя.

Яго абшукалі,ператрэсьлі ўсе кішэні, вельмі уважліва перагледзілі ўсе паперачкі, якія ў яго знашліся, забралі ўсе грошы, якія, праўда, цаны для іх ня мелі, апрача колькі дзесяткаў рублёў царскіх грошай.

—Адвядзеце яго да комэнданта, — скамандваў унцерафіцэр,—і далажэце яму, што гэтага малойчыка трэба добра распытаць.

—Ты, Булякін, будзь старшым. З табою пойдуць Ахрэменка і Пятручок... Марш!

—Ну, марш!—скамандваў Булякін.

Уперадзе ішоў Ахрэменка, за ім Сяргей Карага, а Булякін з Пятручком ішлі па баках.

На першых часох, покі не адышліся з вачэй начальства, Булякін пакрыкваў, як начальнік, каб паказаць, што ён і запраўды службу спаўняе і свае абавязкі выконвае строга. Потым ён прымоўк, і некаторы час усе ішлі моўчкі.

Неба на ўсходзе пачынала сьвятлець.

Павеяла ранішнім халадком. Акропленае расою поле пахла сырасьцю. Пачуліся сям-там галасы раньніх жаўранкаў. Вакол было ціха і лагодна. Дзе-ні-дзе з прадрасьветнага змроку вынікалі вёскі з сваімі ветракамі. Ветракі, як грозныя часавыя-вартаўнікі, узьняўшы свае рукі, стаялі каля гэтых вёсак.

Сяргей Карага, шчыльна сажмаўшы губы і ссунуўшы бровы, думаў свае невясёлыя думкі. Яго душу ахоплівала нейкая злосьць і ненавісьць ад аднае толькі думкі, што яму прыдзецца стаяць перад афіцэрамі, якія будуць яго распытваць, зьбіраць весткі аб тым, дзе іх войска, хто ён сам і г. д.

А даведаюцца, што ён комуністы... тады капут! І яму нязвычайна моцна хацелася жыць, хацелася быць сьведкаю тых вынікаў жыцьця, якія прынясуць з сабою комуністыя, і

тых форм новага будаўніцтва, у якія выльлецца гэтае жыцьцё. Дый само па сабе гэтае жыцьцё так цікава. А ён, па праўдзе сказаць, яшчэ й ня жыў. То бадзяньні па вастрогах у царскія часы, то работа ў партыі, то гэтая вайна... Ніколі раней ня думаў ён аб сьмерці, а вось цяпер яна ўспомнілася.

Ён колькі раз скоса аглядаў сваіх канвойнікаў, незаметна паварушваў зьвязанымі рукамі, пробуючы, як моцна яны зьвязаны; і акідаў вачыма гэтыя, такія мілыя, такія павабныя далі, што больш і больш вырысоўваліся і асьвятляліся ясным усьмехам новага дня...

„Эх, умелымі рукамі зьвязаны яго рукі! І трудна ўцякаць цяпер... Не, лепш пачакаць, а можа добрае здарэньне падвернецца яму. Ня можа быць, каб ён яшчэ не пажыў на сьвеце“.

Дадаўшы больш вясёлую выразу свайму твару, Сяргей сказаў:

—Эх, братцы! Курнуць бы, эх, курнуць!

—Да гэта бадай што і не пашкодзіла-б,—прамовіў старшы Булякін.

Перад імі ўперадзе стаяла старая разложыстая вярба. Параўняўшыся з ёю, Булякін весела. жартліва скамандаваў:

—Стой! Аправіцца, пакурыць!..

—О, гэта голас!—прамовіў Пятручок.

Канвойнікі і іх палоньнік спыніліся пад вярбою, заразжа падаставалі кісяты і пачалі вярцець папяросы. Карага сядзеў са зьвязанымі рукамі, чакаючы, што будзе далей Самому яму не хацелася прасіць, каб яму разьвязалі рукі.

—А ты чаму ня робіш папяросы?—зьбіваючы на украінскую мову, спытаў яго Ахрэмэнка,—ня то, каб пасьмяяцца, ня то, каб зьвярнуць агульную ўвагу на зьвязаныя рукі Карагі.

—Дзівак, ты,—адказаў яму Пятручок:—ці-ж ты ня бачыш, што ў яго рукі зьвязаны?..

—То як-жа ён закурыць?—пытаньнем адказаў Ахрэменка.

Ахрэменка й Пятручок зірнулі на Булякіна.

Булякін чуў, што слова цяпер за ім. Яму крыху і падабалася, што ён тут мае найбольшую вагу, але ён таксама не забываў, што ён старшы, якому даручаны злоўлены комуністы.

—А ты ўцякаць ня будзеш?—запытаў Булякін Карагу.

—Куды ён тут уцячэ?—адказаў за Карагу Ахрэменка:—і дзесяць крокаў не прабяжыць, як я пасаджу яго на мушку. Ня трэба забываць, што я на сто крокаў зьніжу варону, ня то што чалавека,—на ўсякі выпадак дадаў Ахрэменка.

—Вас тут трое, а я—адзін; у вас вінтоўкі, а ў мяне голыя рукі, дый то цяпер зьвязаныя,—сказаў Карага.

—У іх такія справы вырашаюцца галасамі,—зьвярнуўся Булякін да канвойнікаў:—давайце хіба, і мы пагаласуем. Хто за тое, каб разьвязаць яму рукі?

Ахрэменка й Пятручок разам паднялі высока рукі.

—Большасьцю галасоў пастаноўлена разьвязаць табе рукі.

Не чакаючы прыказу, Пятручок кінуўся разьвязваць Сяргею рукі. Ахрэменка падкінуў яму бліжэй кісет з махоркаю.

—Ты-ж, брат, глядзі ў мяне,—зьвярнуўся да Карагі Булякін:—і ня памыкайся ўцякаць. Мы таксама служым і службу сваю знаем, а нашых шампалоў на сваёй сьпіне ты не панясеш!

Скруцілі папяросы. Успыхнула запалка ў руках Пятручка бледна-чырвоным выбухам полымя,—і скора сінія клубочкі махорачнага дыму павольна сталі паднімацца ўгору, пад галіны старой вярбы, і агоньчыкі ад папярос. як зорачкі, паблісквалі то ў таго, то ў другога салдата, як сымбалі спакою й згоды.

— Уцячэш, — у нейкім задуменьні, як-бы ў тон сваім уласным думкам пачаў Ахрэменка:— ці мала блутаецца цяпер нашага брата? Вось і вашы чырвоныя,—іх тут усякі дзень спаткаеш, ідзе бяз усякага табе канвою... Там дрэнна, тут дрэнна. Цьфу!—Ахрэменка вылаяўся моцным салдацкім словам і махнуў рукою.

— Вайна, брат,—уставіў слова Карага.

— Гэта—вайна?—зьняважліва спытаў Пятручок:—каму патрэбна такая вайна. Табе, Булякін, патрэбна яна? Табе, Архэменка, ці мне яна патрэбна?.. Да прападзі яна пропадам,

халера-б іх паела! Усе яны за народ ідуць: Мікалай, пішучы свае маніфэсты, казаў, што яму вельмі блізка сэрцу дабро народу; Керанскі выступіў за народ, Карнілаў ішоў за народ, Дзянікін ідзе за народ, і Ленін з Троцкім ідуць за народ. Здаецца-б гэтаму народу і паміраць ня трэба. А гэты народ гноіць сваёю крывёю і касьцямі зямлю, корміць вошы, дохне з голаду, з тыфусу і сам сябе зьніштажае, і водзім мы самі сябе, як арыштантаў. Сёньня цябе злавілі, вядуць пад штыкамі, заўтра—мяне... Эх, браткі, каб мая Горадзеншчына да была бліжэй! Паляцеў-бы я туды. У лес-бы зашыўся, ніякіх чартоў не хацеў-бы знаць, ядры тваю качалку!

— Так брат, ці ня так?—зьвярнуўся Пятручок да Сяргея Карагі, а потым, як-бы схамянуўшыся, дадаў:

— Ты, можа з якіх там важных паноў, сам можа якое начальства, дык табе магло і не спадабацца штось з таго, што я сказаў. Кажы, брат: я абвяшчаю поўную свабоду слова пад гэтаю вярбою!

Карага слухаў, што гаварыў Пятручок, і хмурыўся. А калі той скончыў сваю прамову, ён значна павесялеў.

— Не, браток, я не з паноў і не з начальства. Я—сын будачніка, і бацька мой—мужык, служыў у сваім часе на жалезнай дарозе, а дзе ён цяпер—ня ведаю; і ты, брат, відаць ня ведаеш аб сваёй радні. Я вельмі рады, што мы з табою чуць-чуць не землякі, бо бацька мой жыў на пятай будцы ад Пінску, туды, к Брэсту, а сам я быў рабочы ў жалезнадарожных майстэрнях на станцыі Пінск.

— То й я-ж адтуль блізка,—прамовіў Ахрэменка:—я з Валыні!

— Дык вось мы дзе спазналіся: пад гэтай вярбою!—весела прамовіў Карага. Добры настрой яго шмат падняўся, а надзея на палепшаньне яго справы мацней адчулася ў сэрцы.

— А можа й старшы, калі не зямляк, то блізкі наш сусед?

— Я—курскі,—адказаў Булякін.

— Ён ні хахол, ні кацап, а проста курскае „каё“,— дапоўніў Ахрэменка.—І чакае, покі дойдзе да Псяльца, а ён тут, ужо ня вельмі і далёка.

— А ад Псяльца ён болей не ваяка,—дадаў Пятручок і засьмяяўся.

— Псялец...—прамовіў Карага. У яго чуць-чуць не сарвалася няўмысьля, што там стаіць штаб іх дывізіі.

Абстаноўка, як відаць, складаецца прыхільна для яго.

Памаўчалі.

Дакурылі папяросы.

Ахрэменка, Пятручок і Карага адразу пачуліся, што ў іх ёсьць нешта такое, што злучала іх і рабіла блізкімі па душы, ня гледзячы на рознасьць іх характараў і на тыя дарогі іх жыцьця, па якіх яны йшлі дагэтуль і якімі хацелі-б пайсьці далей.

Карага сядзеў, апусьціўшы галаву, і штось думаў. А потым ускінуў погляд на сваіх таварышоў-канвойнікаў, правёў рукою па лобе, усё яшчэ разважаючы аб тым, ці варта даваць адказ на прамову Пятручка, дзе так суката вызначылася неразуменьне і няўменьне разьбірацца ў грамадзянскіх пытаньнях, ці лепей памаўчаць. Але ўсё казала за тое, што выказацца трэба, каб аб ім судзілі болей справядліва і каб не пазіралі на яго, як на нейкае страшыдла з вывескаю „комуністы“.

Таксама важна і тое, каб яны на гэту вайну глянулі з другога боку.

— Так, братцы мае,—пачаў Карага нясьмела:—вайна наогул дрэнная рэч, ніхто яе ня хоча, кожны яе праклінае, і тым ня меней мы ваюем. Чаму-ж гэта так вышла? Ваявалі з немцамі, з аўстрыякамі, з туркамі, з баўгарамі, а цяпер вось самі з сабой ваюем. Калі пачыналі першую вайну, то не запыталіся ў мяне з вамі, хочам мы гэту вайну, ці не. Нас проста пагналі, як жывёлу, пад нямецкія і аўстрыяцкія кулі. А хто пагнаў? Нас пагнаў капітал,—наш і чужаземны; нас пагналі буржуі, багатыры, дваране, тыя самыя прадстаўнікі багатых кляс, у чыіх руках была ўлада, тыя самыя драпежнікі, што выцягалі з нас жылы й без вайны. Яны не пагадзіліся між сабою, кінулі свае народы, сялянства і рабочых у гэту крывавую калатушу. Але ня вытрымалі мы.

За часы вайны прасьвятлелі нашы вочы, мы зрабілі рэволюцыю, скінулі цара. Зьявіўся Керанскі. Ён ішоў ад імя народу і нібы бараніў яго інтарэсы. Але Керанскі схаўрусаваўся, увашоў у згоду з тымі-ж драпежнікамі, езьдзіў па фронце, агітуючы войска за вайну, за гэту непатрэбную нам вайну, вайну за інтарэсы буржуяў. Вось тады, таварышы, падала свой голас наша партыя, партыя бальшавікоў. Яна сказала: „далоў Керанскага! Далоў вайну за інтарэсы купцоў і дваранства!“ Улада перашла ў рукі нашае партыі. Але ці маглі з гэтым пагадзіцца багацеі--царскія гэнэралы? І вось, апіраючыся на чужаземны капітал, часткаю самых на сябе, часткаю на несьвядомы свой народ, выступілі яны з усіх канцоў проціў бальшавікоў, каб вярнуць сабе уладу, каб пасадзіць нас ізноў на ланцуг. Але ў шырокіх слаёх народу не знаходзілі яны сабе падтрыманьня. Не павязло Карнілаву, не павязло Калчаку, Юдэнічу. Знашоўся Дзянікін, у чыіх радох і вы, таварышы. Хіба-ж вы сьляпыя, таварышы? Ня бачыце, што нясе Дзянікін народу? У тых мясьцінах, якія захапіў ён, адбудоўваецца стары царскі парадак, прыходзіць старая паліцыя, за ёю цягнецца густы шэраг земляўласьнікаў. Як галоднае крумкаччо на трупы, зьлятаюцца яны на свае старыя гнёзды, разбураныя рэволюцыяй, і пачынаюць пры шчырай дапамозе паліцыі, зьбіраць свае растрачаныя манаткі, высечаныя ў іх лесе дубкі і розную надобу. Сялян б'юць шампаламі, расстрэльваюць, а пра комуністых і гаварыць ня прыходзіцца. Хіба-ж, таварышы, люба вам гэта ўлада, гэты парадак? Я—комуністы, я ня буду таіцца ад вас! Калі-ж вы знаходзіце, што я ваш вораг, то скажэце пра гэта таму, да каго вы мяне вядзіцё, і мяне застрэліць бяз суду першы ваш афіцэр, як толькі ўбачыць перад сабою чалавека з гэтым ненавісным яму імем.

Апошнія словы Сяргея Карагі зрабілі моцнае ўражаньне на канвойнікаў.

Булякін пачухаў патыліцу, хацеў штось прамовіць, але, зірнуўшы назад, ён увесь здрыгануўся: ззаду па тэй-жа дарозе ехаў верхавы.

— Афіцэр! Ну! Хлопцы, жыва на ногі!—сказаў Булякін і падняўся. За ім моўчкі падняліся ўсе, пастроіліся і пашлі далей. Хвілін праз колькі іх дагнаў коньнік.

— Кагс вядзіцё?—спытаў афіцэр, параўняўшыся з імі. Сэрца ў Карагі апала. Не чакаючы адказу Булякіна, ён сам прамовіў:

— Перабежчык!

— Ну, валяй! — скамндаваў афіцэр і паімчаўся далей.

— Маладзец ты, брат, знашоўся, што сказаць,—пахваліў Карагу Булякін.

— Так мы й будзем цябе тут называць,—дадаў Пятручок.

— Ты, брат, ня бойся, скажам: перабежчыка прывялі,— аклікнуўся Ахрэменка.

Сяргей Карага пачуў, што яго канвойнікі будуць трымаць яго руку, і што яны, ва ўсякім разе, ня ворагі яго.

А на гэтай вайне перабежчыкі як з аднаго, так і з другога боку—звычайная зьява, і імі з начальства мала хто цікавіўся.

—Толькі вось што, братцы,—сказаў Пятручок:—ці не пакажацца гэта падазрэнным, што перабежчыка тры салдаты вядуць?

Сяргею і самому здавалася ня зусім добрым, што яго вядуць пад такім канвоем. Казаць-жа аб тэтым раней ён не адважваўся, ня ведаючы, што за людзі гэтыя хлопцы.

Цяпер гэтае пытаньне было разгледжана агульна, і пастаноўлена было так: Булякін павядзе да комэнданта адзін, а Ахрэменка і Пятручок проста куды-небудзь схаваюцца.

Ужо пачынала ўсходзіць сонца, калі яны падыходзілі да станцыі жалезнае дарогі, дзе і быў комэндант, да якога вялі Карагу.

Уся станцыя была забіта вагонамі і цягнікамі. Зірнуўшы на гэту станцыю, Карага адразу пачуў, што тут зусім другая абстаноўка. То з таго, то з другога вагона выходзілі ў наплечніках афіцэры, і ўсё напамінала так ясна, так яскрава абстаноўку царскіх часоў, ад якіх Карага даўно ўжо адвык,

і нейкая варожасьць ахапіла яго душу, і ён пачуў тут страшэннае адзіноцтва.

„Толькі-б адбыць гэты налог, скарэй-бы разьвязацца“, думаў Карага, а ў галаве яго складаўся плян пабегу адгэтуль у сваю сям‘ю, к сваім таварышам.

Ён, нават, пацяшаў сябе думкаю, што можа не адзін ён вернецца ў свой полк, а з таварышамі, якіх ён ужо знашоў тут.

Эх, і будзе-ж аб чым пагаварыць!

Ахрэменка з Пятручком адсталі, а ён з Булякіным ішоў яшчэ некаторы час па станцыі. Гэта хада паказалася яму нязвычайна доўгаю. Часамі сустракаліся афіцэры, і некаторыя з іх, кінуўшы кароткі погляд на Карагу, казалі:

— Іш ты, зашчытнік Троцкага!

Прашлі міма бранявіка. На бранявіку красаваўся надпіс „Слава афіцэру“.

Успомнілася, што гэты бранявік меў частыя стычкі з іх бранявіком „Чорнаморац“. Аб гэтых стычках многа было гутарак у іх палку.

Станцыя канчалася. На запаснай пуціне, ужо недалёка ад сэмафору, стаяў вагон з надпісам „Комэндант“.

Тут Булякін здаў свайго палоньніка дзяжурнаму салдату.

— Перабежчык! Прыказана адвясьці да комэнданта.

Салдат прыняў Карагу, а Булякін вярнуўся назад.

Комэндант, малады падпаручык, сядзеў за сталом і, ссунуўшы бровы, зірнуў на Карагу. Тут-жа, у вагоне, у кутку каля вакна стаяў яшчэ салдат, як відаць, веставы.

Карага не зьвярнуў на яго увагі. Затое-ж гэты салдат паглядзеў на Карагу вельмі уважліва.

— Адкуль прыбыў?

— З трыццаць чацьвертага палка.

— Ня ўмееш адказваць афіцэру!—напусьціўся на яго комэндант.

— Таварыш комэндант, адказваю, як умею.

— Што? Таварыш! Які я табе таварыш?—гнеўна бліснуў вачыма комэндант і аж падскочыў.

Карага стаяў, як ашпараны кіпенем.

— Шампалоў захацеў? Прывыклі там „тавар іскаць“ сукіныя сыны! Ты—комуністы? Што-та тваё рыла нячыстым, здаецца мне!

Карага стаяў, а там, у сярэдзіне, усё траслося ў ім, бурліла.

Ды тут здарылася нешта такое, чаго ніяк не чакаў Карага.

З кутка вагона салдацкім крокам выступіў салдат. Гэта быў праўдзівы перабежчык з трыццаць чацьвертага палка і з тае самае роты, у якой быў і Карага.

Узяўшы пад казырок, ён прамовіў:

— Гаспадзін комэндант, дазвольце сказаць: ён комуністы і ёсьць!

І пацямнела ў ваччу Сяргея. Увесь белы сьвет з яго малюнкамі, зямля, неба, лес і яры, якія ён яшчэ нядаўна бачыў, завярцеліся, крутнуліся ў яго вачох. Ня помнячы нічога, не даючы сабе яснага адказу і паддаючыся аднаму ахапіўшаму яго пачуцьцю, моцнаму, стыхійнаму, ён у момант згарнуў кулакі і рынуўся на комэнданта. Салдат штаўхануў яго ў бок, і толькі па версе галавы комэнданта сьлізгануў кулак Сяргея Карагі і зьбіў яму шапку.

Разьюшаны комэндант выхапіў рэвольвэр, выстраліў два разы. Убег дзяжурны салдат.

Сяргей Карага бледны, з памутнелымі вачамі, стаяў прыпёршыся да сьцяны і праваю рукою трымаўся за левы бок; адтуль біла кроў.

— Дастрэльвай-жа, памешчыцкі прахвост, бо скора ў цябе і гэтага ня будзе здаваленьня,—усьпеў прамовіць Сяргей Карага і асунуўся на падлогу.

Назаўтра досьвіткам Пятручок і Ахрэменка прынесьлі з сабою ў стан чырвоных вестку аб тым, што сталася з Сяргеем Карагаю.

ДАЧАКАЎСЯ

Раман Шулдзяк толькі што адпрог з плуга каня і пусьціў яго папасьвіцца ў маладым дубняку над ярам, а сам разьлёгся пад ценем разьвіслага дуба.

Эх, люба ты, часіна сапачынку, пасьля працы! А Раман такі папрацаваў: ужо па полі ходзячы за плугам, спаткаў ён усход сонца. Спачатку работа ня ладзілася—проста ня было ахвоты працаваць, бо яго надзел быў самы горшы. Але як гэты надзел дастаўся яму па жэраб'і, то й ня было на каго наракаць. Ды ўсё-ж такі трэба было спагнаць сваю злосьць хоць на чым ці на кім-небудзь. І праўда, Раман, праводзячы першыя баразны, кіпеў злосьцю на новыя парадкі, а больш за ўсё на гэту „камунію", бо вельмі-ж было крыўдна, што яна лічыла яго кулаком; асабліва гэты басяк, Кандратаў Хведзька, дапякаў яму. Ну хоць-бы чалавек, а то проста лодыр, прагуляў сваю зямлю яшчэ да вайны, а потым пашоў бадзяцца па капальнях, нідзе не затрымаўся, у Сібір пераехаў і там не асеўся, а цяпер, вось, вярнуўся, засеў у панскім доме і крычыць: „Я—пралетары, а вы—кулакі, забралі ўсё і смокчаце маю кроў!" Падабраў сабе хаўрусьнікаў, зрабіўся прадсядацелем „комітэту беднаты"; сам нічога ня робіць, толькі ходзіць са сваёй кампаніяй па заможных гаспадарох, каб дзе што ўзяць і заткнуць сваё паганае горла. Нябось, ваяваць за камунію ня хоча йсьці. „Мы, кажа, больш патрэбны тут, у тылу, чым на фронци.

Дадумаўшы свае думкі аб Кандратавым Хведзьку да таго моманту яго жыцьця, калі гэты самы Хведзька папаўся на хабарох і з гэтае самае прычыны быў скінут з пасады „прадсядацеля“ і аддадзены пад суд, Раман крыху заспакоіўся. Работа памалу ўцягнула яго ў сваю абладу. Ён шпарка хадзіў за плугам і толькі на заваротах выціраў свой мокры лоб, адсоўваючы на патыліцу шапку. І толькі тады, калі сонца ўгрэла, як мае быць, а конь і сам ён парадкам натаміліся, ён выпраг каня, каб пахадзіў па траве, і сам прылёг пад гэтым дубам.

Дзень быў ясны, цёплы.

На полі зачыналі ўжо зацьвітаць грэчкі.

Колькі моманту Раман ляжаў нярухліва, адчуваючы прыемнасьць і асалоду сапачынку, ляжаў, заплюшчыўшы вочы. Проста не хацелася нават і паварушыцца. Але нярухомасьць цела прышлося ўсё-ж такі парушыць: чуваць было, як ціснулі аборы, уядаючыся ў яго стомленыя, ацёкшыя ад хады ногі. Раман прысеў, каб разуцца.

Павольна, не сьпяшаючыся, разьвязаў ён аборкі, зьняў з ног цяжкія вяровачныя лапці, якія чамусь называліся „керанскімі“, вытрас з іх чорныя грудкі зямлі і шпурнуў на сонца прасушыцца. Цяпер было зусім добра, вольна.

Рамана марыў сон. Ён глянуў на каня санлівымі вачамі, як-бы штось разважаючы. Конік весела згрызаў маладую пахучую траўку і громка пырхаў.

— Здароў, малы,—адказаў Раман на гэтае пырханьне і лёг сьпіною на зялёны дзірван, выцягнуўшыся ва ўсю даўжыню свайго здаравецкага цела.

Ён заплюшчыў вочы і ўжо пачынаў драмаць. Як нейкія цені, у галаве яго прасунуліся ўспаміны, вобразы даўно перабытых часоў. Прасунуліся і зьніклі.

— Гу-у-ур-р!

Дзесь далёка, як-бы з-за зямлі, да вушэй Рамана данёсься нейкі глухі гром.

—Няўжо ўстае хмара і зьбіраецца дождж?—падумалася Раману.

Паварушыцца і паглядзець на неба яму не хацелася, бо так добра было ляжаць. Ён зноў сьцішыўся, гатовы заснуць.

Гром пракаціўся яшчэ раз і ціха скалыхнуў паветра. Цяпер гэты гук быў многа выразьнейшы. Раман пачуў, што яго нешта як-бы штурханула з сярэдзіны, бо ў голасе гэтага грому пачулася штось новае і страшнае.

Ён прысеў і прыслухаўся. Неба было яснае, спакойнае. Там-сям на небе стаялі камячкі белаватых хмурынак, як адзнакі добрае пагоды. Зрэдка павяваў невялічкі паўднёвы ветрык, ціха калышучы лісьцё дуба. Раман прыслухоўваўся нядоўга: таемны гук грымнуў і ў трэці і ў чацьверты раз.

Ну, цяпер ясна: гэта грымелі гарматы, і гук іх данасіўся якраз з поўдня.

Сон разьбіўся. Раман сядзеў і слухаў, як грымелі далёкія стрэлы гармат, і ў яго душы падымаліся нейкія хвалі многалучнага пачуцьця і нейкага нявыразнага настрою. Перш за ўсё адчуваўся страх, але разам з тым было і штось прыгожа-павабнае ў гэтым далёкім грукатаньні, і нейкая няясная надзея калыхала сэрца Рамана. Якая гэта была надзея, на што накіроўвалася яна, якая яе была істота—Раман ня мог разабрацца. У яго выабражэньні пачалі выяўляцца малюнкі вайны, ён стараўся вызначыць тое месца, дзе грымелі гарматы, і ўжо пачаў вылічаць, калі да іх ціхага сяла дакоціцца хваля вайны.

А страшныя гукі, так моцна калышучы душу, усё грымелі і грымелі, то кароткія, то пацяжныя. Яны парушалі звычайную плынь жыцьця Рамана, яны прыносілі новыя пачуцьці і выклікалі цэлы шэраг новых пытаньняў.

Раману хацелася падзяліцца з кім-небудзь сваімі ўражаньнямі, сваімі думкамі.

Ён абвёў вачамі поле. На полі было ціха і пуста, ні душы. Яму здавалася, што поле і гэтыя яры з іх хмызьнякамі і дзікімі грушамі, і гэтыя невялічкія ляскі, раскіданыя сямтам цёмна-сінімі кудзеркамі, таксама мелі цяпер нейкую нязвычайную выразу, як-бы іх засмуціла зусім новае і неспадзяванае пытаньне. Вярсты дзьве, па той бок яру, стаяла іх

сяло, а з аднаго і з другога боку—цэлы рад ветракоў з занямелымі крыльлямі. Вецер заспакоіўся, і некаму было вярцець іх крыльлі, хоць у апошнія часы і пры добрым ветры сталі яны нярухома, бо ня было чаго малоць.

Раману было маркотна. Ён падняўся, падышоў да коніка. Конь старанна згрызаў сакаўную траву, аганяючы хвастом надаедную заедзь. Убачыўшы каля сябе гаспадара, ён прыветна падняў галаву, хрумстаючы траву. Раман зьлёгка, з любасьцю патрапаў па шыі коніка і прамовіў:

— Эх, ты, конік, мой конік! Дурны ты, брат! Там гарматы гудуць, а ты нічога не разумееш і вухам не вядзеш. Скаціна ты, скажу табе, неразумная!

Конік шаргануў разоў два галавою аб руку гаспадара ды зноў пачаў скубсьці траву. Раман яшчэ пастаяў трохі каля свайго коніка, пазіраючы на яго, і чагось уздыхнуў, а потым запыніўся за разложыстым арэхавым кустом, дзе гук гарматных стрэлаў адбіваўся яшчэ выразьней.

— І здорава-ж бухаюць,—ціха прамовіў Раман і сам сабе паківаў галавою.

Па сьцежачцы, што вілася напрасткі ад лесу і бегла праз гэтае поле, павольна пасоўваліся якраз сюды дзьве чалавечыя фігуры. Сьцежачка злучала сяло Ліпавец з валасьцю. Да валасьці адгэтуль было ня больш як чатыры вярсты Заўважыўшы людзей, Раман ажывіўся і значна павесялеў. Там, у валасьці, напэўна дачуліся яны якіх-небудзь навін. Цікава будзе пагаманіць з людзьмі і абсудзіць гэтае новае палажэньне рэчаў, аб якім так грозна загаварылі гарматы, бо толькі такім чынам, шляхам агульна-грамадзкага высьвятленьня пытаньня, складаецца сталая грамадзянская думка. Раман прызіраўся, стараючыся згадаць, хто гэтыя людзі. Аднаго ён ужо пазнаў: то быў недалёкі сусед, сталяр Пятро Мазалеўскі. Праўда, і пазнаць яго было ня трудна, бо ня было другога такога чалавека ва ўсім Ліпаўцы, так бедна адзетага і наогул такога горкага бедака, як гэты сталяр Пятро. Яго аблезлая, круглая шапка даўно ўжо страціла ня толькі свой былы надворны выгляд, але згубіла і самую гісторыю свайго

пахаджэньня. Яна нязьменна сядзела на галаве свайго ўладцы, зрабіўшыся як-бы часткаю гэтае галавы. Кароткі кажушок, калісь меўшы белы колер, цяпер быў зямліста-шэры, аблеплены латкамі рознае велічыні, гатунку і формы. Тут былі латкі палатняныя, кажурынкавыя, суконныя, раменныя. Полы кажушка скончваліся пашматованымі, абтрэпанымі лахманамі, якія пры хадзе і пры ветры рабілі вельмі сьмешныя і замыславатыя рухі. І трэба зазначыць, што ва ўсім сяле ня было другога чалавека, такога прыхільніка да новае ўлады, як Пятро. Ня гледзячы на тое, што рэволюцыя падсекла яму крыльлі, зьнішчыўшы яго грошы, якія зарабіў ён сваёю сталяркаю, жывучы дзесь у Кацярынаславе, і палажыў іх на кніжку, Пятро зусім не наракаў за гэта на рэволюцыю. Гэта прыхільнасьць да новае ўлады выплывала ў яго ад бескарыснага сэрца, яна паланіла, захапляла яго вяліччам і хараством ідэі, калі людзі будуць мець роўнае права на карыстаньне добрабытам, калі ня будзе гэтага абіраньня чалавекам чалавека і зьнікне гэта векавечнае прыгнячэньне багатым беднага.

Дык што значаць яго прапаўшыя грошы ў параўнаньні з тым новым ладам жыцьця, які зараджаўся на яго вачохі якому пагражалі тысячы ворагаў з усіх бакоў і пад套 рознымі лёзунгамі?

Хіба ў такія моманты можна думаць аб гэтых грошах? Да будзь яны тры разы пракляты!

У хаце Пятра была страшэнная беднасьць. Дзеці сядзелі на печы голыя, босыя. Аб хлебе і гаварыць ня прыходзілася. Хлеб замяняўся бульбаю, просам. Ня было нават дроў, і ў той час, калі сяляне, меўшыя коні, вазілі і завальвалі дубамі свае двары, Пятро мусіў на ўласных плечах насіць дровы. Але з лесу іх многа не наносіш, бо лес быў далёка. Прыходзілася проста адкопваць з-пад сьнегу пні, каб нашчапаць сабе дроў.

Прабаваў зьвярнуцца за дапамогаю да Хведзькі Кандратава, каб паджыцца хлебам. Але хіба то быў чалавек? Хіба меў ён спагаду, сумленнасьць? Сам-то ён еў хлеб, сеяны на самае тонкае сіта, а для Пятра не знаходзілася ні аднаго пудзіка.

З гэтым Пятро яшчэ пагадзіўся-б, бо што рабіць, калі хлеба няма, калі сама Масква, дзе жыве душа і мозг рэвалюцыі,—галадуе. Туды трэба даваць хлеб, трэба падтрымаць тых, у чыіх руках знаходзіліся лёсы рэвалюцыі. Але куды-ж ішоў хлеб, рэквізаваны ў багатых гаспадароў? Ён расходзіўся па руках спэкулянтаў, яго адвозілі ў Рыбінскія Буды і выменьвалі на самагон. І ўсё гэта рабілася з ведама Хведзькі Кандратава. І гэта называецца комітэт беднаты!

—Вось хто капае магілу савецкай уладзе,—у абурэньні душы казаў Пятро:—такіх сволачаў трэба гнаць, расстрэльваць такіх гадаў!

Спадарожны Пятра быў Захар Палянскі, мужык сярэдніх гадоў, досыць заможны гаспадар.

Раман сядзеў пад дубам, то прыслухоўваючыся да грому гармат, то паглядаючы на падарожных. І цікава: у тыя моманты, калі заціхалі гарматы і доўга ня чуваць было іх грому, Раман чагось маркоціўся, як-бы для яго нешта трацілася; калі-ж іх грукат зноў дрыгацеў у паветры, калышучы і поўнячы яго грознаю музыкаю зьнішчэньня, Раману зноў рабілася страшна і разам з тым і прыемна, бо ў гэтым грукаце чуецца нейкая моц, ёсьць бура жыцьця, а кожная бура і палохае і захапляе.

II

Пятро і Захар ужо былі недалёка. Раман разьвязаў кісет у той надзеі, што ўжо адзін выгляд гасьцінна разьвязанага кісета зьверне на сябе увагу падарожных і паслужыць яшчэ аднэю зачэпкаю для таго, каб Захар з Пятром прыселі тут, тым болей, што тутун меўся ня ў кожнага, бо трудна было доставаць яго.

І ён не памыліўся. Пятро і Захар падыходзілі сюды, су'рёзныя і задумлёныя.

—Чуеце, як грукоча?—Такім запытаньнем спаткаў Раман падарожных.

—Здарава жарацъ,—адказаў Захар, здароўкаючыся з Раманам.

Пятро, пануры, заклапочаны, моўчкі апусьціўся на дол.

—І дзе-б гэта магло быць?—запытаў Раман.

—А ўжо на гэты бок Белграду,—прамовіў Захар.

—Белград ужо забралі?!—у нязвычайным зьдзіўленьні аж крыкнуў Раман.

—Гэ, Белград! Ужо вёрст на пятнаццаць сюды за Белград прасунуліся.

—А-а-а!—зьдзіўляўся Раман:—мусіць-жа вялікая, брат, яго сіла—столькі гарадоў забраў!

—Афіцар'ё азьвярэлае прэцца,—глуха прамовіў Пятро:—ня могуць яны пагадзіцца з новым парадкам; ім патрэбен цар, ім хочацца зноў пасадзіць сваё дваранства на нашу шыю.

—А ці ня ўсё табе роўна, хто будзе на табе езьдзіць?—адказаў Раман.

—Наўперад езьдзіў пан, а цяпер езьдзяць Хведзькі Кандратавы. У мяне, к прыкладу, забралі дваццаць пяць пудоў; многа табе з іх далі? Як сядзеў, дык і сядзіш бяз хлеба. Даўней хоць мог зарабіць і жыць, як чалавек. А цяпер што? Заработкаў няма, народ зноў пазьбіваўся па вёсках. Забаранілі гандаль, ня можна двух пудоў хлеба прывезьці з Украіны. А ў яго, кажуць, вольная таргоўля.

—Там, брат, таргуюць. Хлеба белага, хоць заваліся. Былі там. Вось нядаўна вярнуўся з Украіны Родзечка з Гахава, каваля нашага сват. Запынілі яго дзянікінцы ў адным месцы. Распыталі, адкуль і пусьцілі. Толькі кажуць: „Глядзі, каб свае не абабралі. Мы, кажа, праз месяц усю вашу Куршчыну ачысьцім ад вашых комітэтаў“.

—Дык яны, значыцца, народу ня крыўдзяць?—запытаўся Раман.

—Не, не чапаюць. З комуністымі і комітэтамі, праўда, распраўляюцца. Зловяць, дык ужо і ведай порцыю: адлічаць табе дваццаць пяць шомпалаў ды ідзі. А хто паважней—расстрэл!

—Знашоў дурань чарапок і сьмяецца,—з горкаю ўсьмешкаю азваўся Пятро:—слухаю вас, хлопцы, і дзіўлюся: чаму вы радуецеся?!—раптам мяняючы тон, накінуўся Пятро:—

таму, што будуць вас біць шампаламі? Галовы-ж вы капусьцяныя: як гэта вы ня можаце зразумець, што Дзянікін, царскі гэнэрал, нясе вам ланцуг, нагайкі, паліцыю і крывавую расправу.

— А за што ён будзе са мною распраўляцца?—запытаў сярдзіта Раман,—разумеецца, тым не паздаровіцца, хто нарэзаў сабе пасаду ў садох Харланавых, Мархаўцоў і іншых.

Пятро зразумеў, на што ківаў Раман: і яму, Пятру, адвялі кусок саду Харланава для будаваньня.

— А ты-ж сам сьвяты?—пытаньнем адказаў Пятро:—а дубы, якімі пазавальвалі вы свае двары і выганы, адкуль вы бралі? А хто паразвалакаў маёнткі, павыдзіраў апошнія юшкі ў печах? Што-ж ты думаеш: той пан, які прыдзе з Дзянікіным, падаруе вам гэта? Сам прынясеш яму апошні гвозд, што выдралі са сьцяны панскага дому, ды ў ногі будзеш яму кланяцца. Але справа ня ў гэтым. Ты кажаш: „наўперад езьдзіў на нас пан, а цяпер езьдзяць Хведзькі“. Што пан езьдзіў, будзе езьдзіць, калі прыдзе Дзянікін,—гэта шчырая праўда. А Хведзька многа наезьдзіў? Хто стаўляе пана і хто ставіў Хведзьку? Як-жа ты гэтага ня можаш зразумець? Хведзька аказаўся—дрэнь, яго выкінулі, як гнілую падэшву, гадзіны лішняе не аставаўся, пад суд аддалі. А пана ты зьменіш? Ды што гаварыць! Адна справа, калі над табою гаспадараць, а другая, калі ты сам гаспадарыш. Вы пачулі пра шампалы і ўзрадаваліся, даведаліся аб белым хлебе і усьцешыліся! Шампалоў то яны вам дадуць, а вось белым хлебам не пакормяць і гаспадарыць самі і біць будуць вас па мардасах, бо вас можна купіць за белую булку, бо вы няздольны быць гаспадарамі свайго жыцьця... Народ, народ!

Пятро яшчэ штосьці хацеў сказаць, але яму было так горка і крыўдна, а яго слухачы так далёка былі ад таго, што ён ім казаў, што Пятро ня мог далей гаварыць, падняўся, уздыхнуў і пашоў па сьцежачцы. Праз колькі крокаў сьцежачка зьбягала ў яр, густа зарослы кустамі і травою, а ў гэтых кустох разам са сьцежачкаю схавалася і акрытая лахманамі фігура Пятра.

Захар нейкі час яшчэ сядзеў і гутарыў з Раманам. Яны ўжо не зварачалі увагі на тое, што гарматы грымелі і рабілі там нейкую справу. Цяпер Захар казаў аб навінах, якія чуў ён у воласьці. Першая і самая грунтоўная навіна— у іх воласьць гэтымі днямі прыдзе дывізыя войска, якое, разумеецца, будзе стаяць па вёсках. У іх-жа Ліпавец прыгоняць цэлых два палкі. Дачуўшыся аб гэтым, Раман моцна задумаўся і яшчэ мацней пачухаў патыліцу. Лёгка сказаць—два палкі! Гэта значыцца паставяць у двор па 10-15 чалавек і трэба іх карміць. Ну, але раз трэба, то трэба—нідзе ты ня дзенешся. Дрэнна толькі тое, што салдат любіць часамі і ў пограб зазірнуць і ў кубелец з салам залезьці. Таксама не адкіне ён і мёду, а ў Рамана быў добры пчольнік, вульлёў на сорак. Усё гэта моцна засмучала Рамана. Апрача таго, па вёсках пачалі зьяўляцца вайсковыя атрады і вясьці строгую расправу з дэзэртырамі. Забіралі каровы, коні з тых двароў, дзе былі гэтыя дэзэртыры, бо становішча для рэспублікі стваралася небясьпечнае, прыходзілася прымаць надзвычайна строгія меры.

І тут трэба было Раману паламаць галаву: яго Іванька таксама дызэртыр.

— Эх, галоўка ты мая!—уздыхаў Раман:—калі-ж гэта людзі прыдуць да чаго-небудзь аднаго? Калі скончыцца ўся гэта суматоха?

— Як-небудзь, брат, будзем жыць,—разважаў Захар,— а там відаць будзе. Ня можа-ж быць: будзе які-небудзь парадак, а там і вайна гэтая скончыцца, хто-небудзь, а возьме верх. А наша, брат, дзела што? Мікалай быў—мы зямлю аралі; зьявіўся Керанскі—аралі, пры бьлашавікох—таксама аром; Дзянікін прыдзе, чорт, д'ябал,—мы ўсё будзем у зямлі капацца.

Захар падняўся і пашоў да сяла, а Раман яшчэ крыху пасядзеў пад дубам, а потым пашоў да сваіх калесень, зьбіраючыся ехаць дадому.

Новы клопат, новыя думкі агарнулі Рамана.

А гарматы, прыціхшы на нейкі час, зноў грымелі грозна і страшна. Цяпер іх размова для Рамана мела больш вы-

значаны сэнс. На душы было неспакойна, трывожна. Прынесеныя Захарам навіны моцна засмучалі Рамана. А горш за ўсё гэтыя атрады. Ужо даўно цягнецца гэта гісторыя з дээзртырамі. Многа разоў прысылаліся грозныя прыказы з ваенных камісарыятаў аб дэзэртырах. Многа раз хадзілі ваякі ў павет і зноў варочаліся дадому праз месяц ці колькі нядзель. Цяпер-жа, відаць, цьвёрда паложана зрабіць канец дэзэртырству.

„Наскочыць атрад, захопіць Івана, тады прахам пойдзе твая гаспадарка“—думаў Раман: „трэба што-небудзь думаць, бо йначай—бяда“.

Раман запрог каня, палажыў на драбінкі плуг і мернаю ступою паехаў паўскрай яру.

Дарога, агібаючы яр, забірала ў поле, потым зноў павярнула канец свае дугі ў бок сяла. Перад самым сялом цягнуўся роўны, прасторны выган. Каля платоў па выгане віднеліся высокія круглыя кучы наваленага гною. У вапошнія годы гаспадары перасталі вазіць яго на поле.—„Што вазіць яго“ разважалі яны: „я ўгнаю поле, а на другі год ім будзе карыстацца другі“.

Так і валяўся гной па выгане бяз усякае карысьці. На гэтым-жа выгане стаялі ветракі, спыніўшы свае крыльлі. Раман таксама меў вятрак. Раманаў вятрак стаяў зусім блізка ад дарогі і меў вельмі прыгожы выгляд. Асабліва многа хараства прыдаваў яму самы верх, накрыты чырвоным жалезам. Але ў гэту мінуту ён ня цешыў Рамана і меў таксама смутную выразу свайго аблічча, як-бы ён спагадаў свайму гаспадару.

Праехаўшы крыху выганам, Раман зьвярнуў да свае клуні. Каля клуні быў Іван. Іван моўчкі стаў выпрагаць каня. Колькі мінут бацька і сын маўчалі.

Раман скоса, украдкам паглядаў на сына. Яму хацелася пагаварыць з ім, аб тым, што ён дээртыр і якія вынікі можа мець гэта дэзэртырства для іх гаспадаркі. Выпраглі каня. Прывязалі каля „кармушкі“. Іван вынес з клуні ў кашалі сечкі.

— Чуў?—зьвярнуўся Раман да сына:—дзянікінцы ўжо Белгарад забралі.

— Па гарматах чуваць, што па гэты бок Белгараду бой ідзе,—адказаў Іван, высокі шырокаплечы дзяцюк, адзеты напалавіну ў казённае.

Раман пачухаў патыліцу.

— Але вось што, Іванькя,—вымаўляючы слова „Іванька" на курскі лад, сказаў Раман:—па вёсках, кажуць, зьяўляюцца вайсковыя атрады, ловяць дэзэртыраў, а гаспадарку іх нішчаць, не захапілі-б і цябе.

— Такія выпадкі ўжо былі,—панура адказаў Іван:—на Данскім хутары з трох двароў пабралі каровы і коні; дзядзя Кандрат сказываў.

— Пабралі?!—апаўшым голасам спытаў Раман:—бач, ты, якія дзяла.

Памаўчалі.

— Нічога, баця, не паробіш, а йсьці-та трэба.

Раман уздыхнуў.

— Ах, ты грэх які! э-хэ-хэ! цмакаў Раман і чухаў патыліцу.

— А ты, Іванькя, глядзі, з розумам рабі: убачыш, што дзела ня выходзіць, дык ты...таго.

— Ведаю, баця, вайсковую службу,—усьміхаючыся адказаў Іван:—варон страляць ня буду, а „прымяніцца да месласьці", як вучыць салдацкая мудрасьць, здарэньня не прапушчу.

Так разважаючы, бацька і сын чулі нейкую фальш і стараліся не глядзець адзін другому ў вочы.

— Якая гэта вайна,—стараўся Раман знайсьці якое-небудзь апраўданьне: хіба гэта вайна?

У хаце за сталом яшчэ пагутарылі аб тым, што Івану трэба йсьці на службу. Бабка Параска, жонка Рамана, трохі плакала па Іване, але ня моцна, бо ўжо прывыкла да яго частых мобілізацый. „Маладайка" Матрона, Іванава жонка, была маўклівa. Іван толькі зімою пажаніўся з ёю, і жылі яны надта згодна. Матрона была высокая, стройная, прыгожая жанчына. Відаць, яна вельмі маркоцілася, што Іван заўтра пойдзе. Яны часта заставаліся ўдваіх і ціханька перакідва-

ліся словамі. Меншыя браты й сёстры Івана, папалуднаваўшы, пашлі на вуліцу. А на вуліцы было так цікава. Сталыя мужчыны зьбіраліся ў гурткі і разважалі аб вайне, якая насоўвалася на іх. Тут-жа расказваліся вельмі цікавыя навіны, падымаліся гарачыя спрэчкі, наогул жыцьцё біла з кожнага кута. Па сяле хадзілі самыя няскладзістыя чуткі.

III

На другі день раніцаю, чуць толькі паказалася сонца з-за таго лесу, што стаяў каля воласьці, Іван быў ужо гатовы да паходу. Цяпер ён зусім выглядаў салдатам. За плячамі ў яго быў досыць пакоўны мяшок з хлебам і скорамам, прыладжаны на палаценцы. Яго спадарожныя, тры таварышы, такія-ж, як і ён ваякі, ужо пастукалі ў вакно, клічучы Івана да свае кампаніі.

— Я даганю вас, хлопцы: ідзеце памалу,—сказаў Іван. Папрашчаўся з бацькамі; Раман, Параска і Матрона правялі яго на двор. Ісьці вуліцаю было нейк нялоўка. Іван пашоў дваром каля клуні. Тут яшчэ затрымаліся, а Раман сказаў на дарогу сыну колькі слоў, сэнс якіх зводзіўся да таго, каб усё рабіць з розумам.

— Ну, шчасьліва,—прамовіў апошнія словы Раман і павярнуў у клуню. Маці стаяла яшчэ колькі мінут і пазірала на Івана. Матрона пашла з Іванам.

— Падыйду з табою да гэтага лесу,—сказала яна, заглядаючы з любасьцю ў вочы Івану.

Агародамі вышлі яны на выган і павярнулі па дарожачцы, што йшла каля плоту.

— Не даюць нам, Іванька, спакойна жыць. Хоць-бы дзянёк таго спакою. І дома ты, а сэрца не на месцы. А пойдзеш—і таго горай.

У Івана таксама на душы было цяжка, а ў галаве варушыліся цэлым роем думкі. І хацелася сказаць маладой жонцы і нават думкі добрыя былі, толькі слоў не знаходзілася адпаведных. І Іван ішоў радам з Матронаю, заглядаў ёй у вочы і толькі вачамі і сьмехам выказваў ёй свае думкі.

Дашлі да лесу. Лес, праўда, пачынаўся недалёка ад выгану. Праўду кажучы, гэта і ня лес быў, а проста так зваўся па старой памяці.

— Глядзі-ж ты, Матрона, ня вельмі-та па вуліцах вечарамі разгульвай,—сказаў прыпыніўшыся Іван.

— Ну, што ты, Іванькя! Як-жа я, мужняя жонка, гуляць пайду?

І паглядзела на Івана з такім дакорам.

Іван абняў яе моцна; моцна і крэпка пацалаваў у сьвежыя і сакаўныя губы.

Пацалаваў і шырокімі крокамі пусьціўся даганяць сяброў.

Матрона, смутная, пастаяла трохі, покі не схавалася фігура Івана за выступам яру, куды павярнула дарога, а потым пашла на свой агарод зьбіраць зельле, падаткнуўшы спадніцу.

Шкода было Раману сына, але-ж за тое было і шмат спакайней. Бяз пэўнае думкі, расчыніў ён у клуню вароты, вашоў туды, аглядзеў сьцены, зірнуў на кучы саломы і вышаў на двор. Крыху пастаяў, зашоў у пчольнік, прашоўся між вульлёў. Ніякае работы на гэты дзень ён яшчэ не назначыў сабе. Дый ахвота нейк адпала за дзела брацца. Яго пацягнула на вуліцу. На тым баку, пасярэдзіне сяла, цягнуўся глыбокі і шырокі яр; з вуліцы чуўся гоман. Раман ужо хацеў пакіравацца туды, але так добра знаёмы са ўчарашняга дня гук зноў пачуўся Раману. Ён зашоў за клуню і стаў слухаць. Грозны гук паўтарыўся грозна і выразна. Ціхае і вільготнае паветра раніцы прыдавала яму яшчэ большую сілу. Здавалася, што гарматы грымелі цяпер шмат бліжэй.

Каля Бажковай клуні таксама стаяў і Пятро Мазалеўскі. Свае клуні Пятро ня меў.

Раман пашоў да Пятра паздароўкацца.

— Мне здаецца, што сёньня гарматы як-бы аддаліліся,— прамовіў Пятро.

— Дзе ты бачыў, аддаліліся,—зусім блізка грукацяць!

Як-бы прыпыняючы іх спрэчку, пракаціўся густы, выразны, акруглены гук.

— Чуеш?—сказаў Раман.

— Што-ж,—прамовіў Пятро: пры стычках усяк бывае. Зарвецца дзе іх банда, вось і выбіваюць.

— Банда, то банда, але глядзі, куды дашлі... Нічога, мусіць, брат, ня будзе, калі ў іх парадак моцны, дысцыпліна, бранявікі, танкі і ўсё, што хочаш.

— Ну, бранявікі! а ў нас, ты думаеш, бранявікоў няма? Прагналі-ж Калчака. Цяпер з таго фронту сюды гоняць войска. Яшчэ, брат, рана ім казырыцца, яшчэ ўсё можа быць.

— Не, Пятро, круціў Раман галавою: штось на гэта не паказвае. Чуткі ёсьць, што ўжо і Курск вывозіцца. Трудна, брат, з імі змагацца.

Пятро маўчаў. Дый што тут казаць. Хіба ты яго пераканаеш. Радуецца кулаччо, бо не па нораву яму новая ўлада.

Раман пашоў на вёску паслухаць, што гавараць людзі. Пятро таксама павярнуў у свой двор. Стаяць на вуліцы і слухаць гэту кулацкую гутарку яму было прыкра.

„Ах, вы жылы, жылы!“ разважаў сам з сабою Пятро: „чакаеце Дзянікіна, ня люба вам, што бедната галаву падняла. Каб часам-жа і самі не заплакалі!“

Нявесела было на душы ў Пятруся. Перш быў за дзела ўзяўся, плот паставіў на сваім надзеле, падгатаўляў мясьціну, каб перанесьці туды сваю хату. Думаў пачаць памалу будавацца. Цяпер-жа ўсё гэта спынілася.

„Задушаць, усё задушаць і зьнішчыць могуць, сволачы!“

Так і спыніў сваю работу Пятро, бо нашто рабіць? Калі прыдуць дзянікінцы, то ўсё будзе зьнішчана ды яшчэ і самога калаціць будуць. Але ня гэта страшна,—страшна, што стары парадак можа вярнуцца. Заможнае сялянства пачало падымаць галаву. То там, то сям стаялі гурткі заможнікаў, якія так ці йначай лічылі сябе пакрыўджанымі беднатою і ў глыбі душы, хоць аб гэтым яшчэ не адважваліся казаць у голас пры ўсіх, былі рады прыходу Дзянікіна. Цішком перадавалі адзін аднаму аб добрых зьменах жыцьця, якія будуць тады, калі ня

будзе ўлады чырвоных. Раман колькі разоў абменьваўся думкамі з людзьмі і яшчэ болей праконваўся ў тым, што верх возьме Дзянікін, і ўжо пачынаў чакаць яго. Тымчасам прыбліжэньне фронту і сур‘ёзнасьць палажэньня адчувалася моцна. Прыходзіла войска, разьмяркоўвалася на больш-менш доўгі час, а праз дзень, другі, яно кудысь выходзіла. Прыбывалі новыя вайсковыя часьці, але доўга не затрымліваліся і перакідваліся то на адзін, то на другі пункт фронту.

А гарматы грукацелі бліжэй.

Раман чутка прыслухоўваўся да ўсяго, што рабілася вакол. Вайна была ўпартая, і часта фронт хістаўся то ў адзін, то ў другі бок, а разам з гэтым то падымаліся, то ніклі надзеі заможнікаў і беднаты. Калі ўдача была ў чырвоных—ажывала бедната і паказвалася на вуліцы. Тады можна было пабачыць і Пятра. Ён выходзіў на вуліцу, шырока расстаўляў ногі і казаў:

— Не. брат, зьбілі Калчака—таксама далёка зашоў,— саб‘юць і Дзянікіна. Усяго народу на ашукаеш і за белы хлеб ня купіш... Што тут талкаваць? Рана вам радвацца,—і Пятро кідаў вочы на крытыя пад жалеза хаты заможнікаў.

Пры спатканьні з Раманам, Пят ро ня мінаў казаць:

— А гарматы ледзь-ледзь ужо чуваць.

Раман дыплёматычна адказваў:

— І дзякуй богу! Ты-ж думаеш, добра было-б, каб фронт прашоў праз наша сяло?

Так казаў Пятру, а сам думаў ня тое і адчуваў засмучэньне, асабліва пасьля таго, калі яго залучылі ў абоз чырвоныя і патрымалі яго з тыдзень, а ў гэты час невядомыя ласуны крыху пахадзілі каля вульлёў без дазволу Рамана.

Раман зноў зьбіраў навіны і, нават, заходзіў да бацюшкі пагутарыць аб справах вайны.

Бацюшка стаяў у самым асяродку навін і на справу пазіраў сьветлаглядна:

— Думаеш, яго сілаю прымусіш адыйсьціся?—казаў бацюшка: сам адступіў, бо правае крыло на фронце Ўрангеля

адстала, а левае залішне высунулася. Але туды паслалі гэнэрала Шкуро. Гэта, брат, гэнэрал! Другі Сувораў!

Раман весялеў—што значыць вучоны чалавек!

Такое хістаньне вайны цягнулася колькі месяцаў. Раман проста змучыўся, чакаючы рашучых вынікаў вайны. Паміж заможнікаў злажыўся, нават, погляд, што Дзянікін ня йдзе проста дзеля таго, каб даць людзям сабраць з палёў.

Раз, пад канец лета, калі гармат колькі дзён зусім ня было чуваць, Раман пачуў, як яны зноў ажылі і загрымелі часта і моцна.

Убачыўшы Пятруся, ён сказаў:

—А чуеш, як блізка зноў грукацяць?

— А мне здаецца,—адказаў Пятрусь,—што яны ўсё на адным месцы.

Але выраза твару Пятруся казала за тое, што гарматы ня вельмі далёка.

Пад вечар таго-ж самага дня стала вядома, што Дзянікін прашоў раку Псёл, а да Псла адгэтуль было ня болей, як дваццаць вёрст. Гарматы грымелі ўжо так, што зямля дрыжала. Блізкасьць вайны адчувалася цяпер усімі. Сярод вайсковых часьцей замячаўся нязвычайны рух. Відаць было, што чырвоныя войскі адыходзілі. Цэлы шэраг хурманак пацягнуўся на поўнач у кірунку на Курск; за хурманкамі праз нейкі час адыходзілі і баявыя ланцугі. Палажэньне станавілася вельмі напружаным. Дзесь, ня вельмі далёка, тухкалі кулямёты, а на горцы ў полі пачалі ўздымацца высокія слупы дыму і пылу. Гэта—выбухі ад снарадаў. Людзі пахаваліся: сяло, здавалася, апусьцела.

Раман чуў, як нейкі страх агарнуў яго душу. На яго вачох выяўлялася разьвязка вялікага змаганьня, сэнс якога ён ня мог ахапіць розумам, але ў сэрца закрадвалася цёмная трывога.

Змоўклі гарматы, сьціхла частае тухканьне кулямётаў. Зрабілася ціха і пуста. Чырвоных ужо ня было, а белыя яшчэ не паказваліся.

Раман стаў разглядацца і патрошкі прыходзіць у сваю звычайную плынь жыцьця. Ён вышаў на двор, аглядаючы свой будынак і сваю гаспадарку. Зрэдка грукацелі гарматы, але ўжо збоку і ў другім месцы. Абярнуўся Раман назад і абамлеў: з вуліцы ў двор уварвалася нейкая, яшчэ ня бачаная ім, банда ўзброеных людзей. Не спадзяючыся нічога добрага, Раман, моцна перапалоханы, падаўся ў патайны кут двара. Сэрца яго крэпка забілася.

У хаце была жонка і нявестка Матрона.

Банда ўвалілася ў хату. Матрона забілася ў цёмны куток сяней і ўся дрыжала.

— Балшавік няма?—пытаўся адзін з шайкі нейкаю ломанаю моваю, а вочы бегалі, як у злодзея.

— Няма, няма,—запаўняла перапалоханая гаспадыня.

Банда борзда крутнулася па хаце, акідаючы поглядам куты і набытак, потым вышла ў сені. У сенях стаяла скрыня Матроны. У гэтай скрыні былі схованы яе лепшыя рэчы: адзеньне, палотны, абрусы, залатыя пярсьцёнкі, рублёў дваццаць срэбра і дзьве залатыя пяцёркі.

Адзін з шайкі, чорны, калматы, як зьвер, узламаў шабляю скрыню і пачаў перабіраць і выкідаць з скрыні тыя рэчы, якія яму больш падабаліся, а больш дробныя і каштоўныя—клаў у кішэню. Другія падбіралі з зямлі хусткі, абрусы.

— Што вы, падлякі, робіце?!—крыкнула Матрона і выскачыла з кутка. Грабежнікі зьнячэўку прышлі ў замяшаньне.

Чорны, акінуўшы Матрону вачамі, расплыўся ў нядобрую ўсьмешку.

— Карош баба! карош баба!

Ён кінуў скрыню, падышоў да Матроны і раптам абняў яе крэпкімі рукамі.

Матрона ў гневе, у страсе стала крычаць, адбівацца, але чорны трымаў яе моцна.

— Пайдэм, дюша мая, пайдэм!—і павалок маладзіцу ў глыб двара.

Матрона баранілася з усіх сіл, біла яго па твары, чап

лялася рукамі ў яго бараду, крычала, клікала людзей, але ніхто не паказваўся і ня йшоў бараніць.

— Нычаво, нычаво, ны бойся!—казаў чорны, а вочы яго гарэлі дзікім агнём.

Ён згроб яе на рукі і панёс у клуню. Матрона змаглася і самлела. Чорны нагою адчыніў клуню і панёс маладзіцу туды.

Раман ня мог болей хавацца. Ён схапіў вілы і кінуўся ў клуню, як зьвер, ратаваць сваю нявестку.

— Погань разбойная, што ты робіш?!—наляцеў Раман з віламі, гатовы прасадзіць яго.

Грабежнік кінуў Матрону, выхапіў шаблю і спрытна адбіў удар, пры гэтым расьсек Раману пальцы.

На яго шчасьце пачалі зьбягацца людзі, падняўся крык, лямант. Чорны, дзіка азірнуўшыся, моцна таўхануў Рамана ў грудзі, зьбіў яго з ног і, махаючы шабляю, пабег да свае банды. Аграбіўшы Раманаву хату, банда пашла на другі бок сяла праз яр.

Прашло з месяц часу. Сялянства на ўласных гарбох адчула ўсю асалоду дзянікінскіх парадкаў. Не па аднэй сьпіне згуляла поліцэйская нагайка. Земляўласьнікі шчыра сталі зьбіраць свой набытак, адбіралі ад сялян кароў, коняй, цягалі іх па судох за сьсечаны лес.

І вось, калі зноў пачуліся стрэлы гармат, на гэты раз ужо з поўначы, а Раман і Пятро стаялі і слухалі іх, і калі Пятро сказаў:

—А ці не здаецца табе, што гэтыя стрэлы раз-по-раз чуюцца бліжэй?

Тады Раман з сьвятлеючым тварам і ад шчырага сэрца адказаў:

— Так, так: гром падбліжаецца!

КРЫВАВЫ ВІР

Дзед Патап прачнууся рана, толькі што пачынала разьвідняцца. Хацеў яшчэ заснуць, але, паляжаўшы трохі, праканаўся, што ўжо не засьне. Ён устаў, адзеўся і вышаў на двор. Ніхто з сялян яшчэ не падымаўся. Пашоў паглядзець каня. Конь стаяў над пустою кармушкаю. Убачыўшы дзеда, прывітаў яго кароткім: гы-гы-гы!

Дзед прыпыніўся каля коніка, сказаў яму колькі добрых слоў і запытаўся:

— Есьці хочаш? дык няма-ж, брат, чаго даць табе!

Але пашоў у пустую клуню.

На таку ляжала кучка сечкі, а ў куточку—крышан сена. Дзед разважліва паківаў галавою. Заўтра трэба ехаць араць: авёс сеяць пара. Не пакарміўшы каня, многа не наарэш. Сёньня-ж сьвята—работы няма.

Дзед разважаў, что корм лепей прыберагчы назаўтра, а цяпер каня можна выпусьціць на пашу. Але, каб ня зводзіць салодкіх надзей каня, ён узяў жменю сена і панёс да кармушкі. Покі конік хрумстаў сена, дзед зьняў з-пад страхі пута і завязаў каню на шыю.

— Ідзі, брат, на свой уласны хлеб.

І павёў з двара.

На вуліцы было ціха і пуста.

Па адзін бок стаялі сялянскія хаты, а па другі—цягнууся высокі пляцень, спускаючыся к возеру. У гэтым плецяні была ўложана і дзедава праца—два гады як гарадзілі тут. А вось гэты высокі кол быў забіты ўласнымі рукамі дзеда Патапа

Нядарма-ж ён і пазіраў на дзеда прыветней ад другіх калоў. Там за плецянём—панскі сад, ліпавая дарожка, дубы старыя і такія слаўныя садовыя дрэвы: грушы, яблыні, вішні. Сад яшчэ пусты; нядаўна зьлез сьнег, але ўжо паказалася зялёная траўка ў садзе.

Падняўшыся на ўзгорак, дзед параўняўся з панскім двäром. Праз двор быў свабодны праход. Дзед прыпыніўся, думаючы над тым, ці абыйсьці гэты двор, ці проста прайсьці праз яго, каб спутаць каня за садам. Падумаў і павёў праз двор. У панскім доме жыве старая пані і яе ўнук, студэнт. Нядзелі тры, як прыехаў ён з Харкава. Цяпер-жа паны пападжымалі хвасты і сядзяць, як мышы пад венікам.

— Мінулася ваша краса,—сказаў сам сабе дзед і досыць сярдзіта зірнуў на панскі дом. Дзед помніць панскую крыўду, моцна яе помніць. Часамі памяць аб ёй прытуплялася, а другі раз так моцна ажыве ў сэрцы гэта крыўда, што хоць ты... няма ведама што! Так, гэта тут, вось у гэтым самым доме, сьвёкар старое пані аддаў такі загад, каб паклікаць матку дзеда Патапа,—Патапу тады было ня болей як паўгода,—каб сваймі грудзьмі карміла яна панскага завадзкога шчанюка. Хіба-ж не балюча было мацеры дзяліць малако паміж сваім Патапкам і панскім шчанюком? А лазою не сяклі яе, каб выбіць з душы яе протэст, протэст мацеры і чалавека? А самому дзеду Патапу прыемна было чуць, калі яго называлі „сабачым братам?“ І ўсёж-ткі, вядучы каня праз двор, дзед апусьціў наніз свае панурыя вочы. З першага разу было крыху нялоўка: калі-ж то бывала, каб мужык вадзіў каня міма вакон панскага дома? І яшчэ трэба помніць, часы сталі штось няпэўныя. Вось людзі кажуць, што з Украіны немец сюды пасоўваецца, і кажуць яшчэ, што ён трымае панскую руку. Аб гэтым яшчэ ўчора хадзілі такія гутаркі. Але дзед пацяшаў сябе тым, што яго ніхто ня бачыў. Зьвярнуўшы за вугал саду, дзед спутаў каня і азірнуўся. На возеры ў чайцы сядзеў ужо каваль, па мянушцы Мамай. Ён стаўляў венцяры і цяпер выехаў глядзець рыбы. Паглядзеў стары Патап і пазайздросьціў: корму ў яго хапае сабе і жывёле і

рыбы ловіць, чорт ведае колькі—вёдрамі цягае! Праўда, Мамай ня раз ішоў з рыбы з пустым вядром, але ў чужой руцэ кусок здаецца заўсёды большым.

Крыху пастаяўшы, дзед павярнуўся і пашоў назад на горку. На горцы стаялі старыя выносныя дубы. Ладныя дубы! Зваліць-бы вунь таго, што на водшыбе стаіць ды папілаваць, слаўныя-б былі дошкі! Крыху ўлева, ня больш як паўвярсты ад панскага дому, была пасада яшчэ аднаго земляўласьніка, але ён зьбег адгэтуль, як толькі пачалася гэта завіруха.

Ой, быў гад!

Бывала, чуць адна ступіць скаціна на яго поле, дык зараз-жа зойме і ўжо, не садраўшы штрафу, ня пусьціць з двара. Затое-ж ад пасады яго засталіся толькі слупкі ды падлога, але добрыя людзі ўжо пачалі выдзіраць дошкі і з падлогі.

Дзед Патап паразважаў трохі над пытаньнем, як-бы і яму садраць з пару дошак, бо людзі разьбяруць, а яму дошкі патрэбны.

Вярнуцца назад панскім дваром дзед не адважыўся. Ён зноў спусьціўся ўніз, прашоў каля свайго коніка. Прыпыніўся.

— Малая, брат, спажыва для цябе,—прамовіў дзед да каня і паківаў спагадна сівой галавою.

Туляючыся ў кустох, пашоў між садам і возерам, кіруючыся на Мамаеву кузьню. Тут дзед знашоў сабе пералаз вышаў на вуліцу.

Вёска памалу зачынала свой звычайны дзень. Губанова „маладайкя“ йшла па ваду. Крыху ніжэй кузьні быў калодзеж. Дзед Патап прыпыніўся каля кузьні: ня вельмі вялікая прыемнасьць спаткацца з бабаю ды яшчэ з пустымі вёдрамі.

Дзед пачаў нават прыпамінаць, каго ён бачыў сёньня першага: мужчыну ці кабету, бо калі ты выходзіш зранку на двор і першую згледзіш бабу, то гэта знак кепскі—будзе якаянебудзь няпрыемнасьць. Аказалася, што першы, каго бачыў дзед, быў каваль Мамай. Хоць і Мамай невялікае шчасьце, але ўсё-ж такі лепш, чым баба. Сям-там над хатамі заклубіўся дым. Дзед Патап таксама зьвярнуў увагу і на дым: з якога боку йдзе вецер, ці ня зьбіраецца часамі дожджык. Але

вецер быў не дажджавы. А трэба было-б, каб прашоў дожджык: трава пашла-б расьці. На выгане каля хаты Сымона-крупарушніка ўжо гаманілі сяляне. Звычайна тут адбываліся сходкі, сюды зносіліся розныя навіны, тут разьбіраліся наогул розныя справы, бо тут было і пасядзець на чым і паляжаць асабліва калі прыгрэе сонейка. Тут-жа йшла і дарога, чужыя людзі йшлі і ехалі па гэтай дарозе то ў горад, то з гораду. Адным словам, месца было добрае.

Дзед зірнуў за возера. Ад лесу па дарозе, як мурашка выпаўзла хурманка. Нехта ехаў сюды.

Павольна зрушыў дзед з месца і пасунуўся да сялян паслухаць, аб чым гавораць людзі. Дзед Патап ціха і стала як і належыць старому чалавеку, павітаўся з сялянамі і стаў крыху збоку. Прыслухаўся, аб чым ішла размова. Гаварыў Рыгор, сын крупарушніка, чорнабароды мужык. Ён лічыў сябе чалавекам разумным. Да новага ладу жыцьця сэрца яго ніяк не ляжала. Любіў слухаць такія чуткі, якія гаварылі не ў карысьць новаму парадку. І калі ён ужо сам перадаваў іх, то пры гэтым не прамінаў зазначыць: „Так бабы гавораць“, бо калі ўжо пачынаюць аб чым гаварыць бабы, то ў аснове іх гаворкі ляжыць нейкая праўда.

Пачатак яго прамовы адбыўся бяз дзеда Патапа.

— ... а калатні можа быць столькі, што ўся вёска захлынецца.

— А прычым тут вёска,—адказаў Губаноў Міхейчык:— няхай адказвае той, хто разбурваў.

Дзед Патап дагадаўся, што размова йшла аб разбураным доме пана Струкава; ад гэтага дому асталіся адны слупкі ды падлога.

„Шэльма ты, шэльма“, падумаў сам сабе дзед Патап: „гаворыць так, як бы ён і пальцам не крануў нічога. А хто-ж, як ня ты, пілаваў бярвеньні ды ў горад на дровы вазіў? Чыя-чыя, а твая, брат, калі што—першая сьпіна заплача.. Ну і народ“.

— Ось так табе і начнуць наводзіць сьледзтва,—гарачыўся Рыгор:—хто, ды што? Сьледзтва можа пазьней павядуць, а

спачатку пусьцяць вёску сьвечкай да бога. Пагараць і вінаватыя і невінаватыя. А з-за каго? З-за якіх там двух-трох прахвостаў!.. Запамагліся, ліха вашай галаве! Народ у нас!

Выходзіла так, што народ тут быў, як зазначаў кожны прамоўца, нікуды нягодны, дрэнь народ, і ў той-жа час ён быў вельмі слаўны народ, бо калі пагаварыць па чарзе з кожным гаспадаром, то ён выказваў сябе з найлепшага боку; усё можна-б з ім зрабіць, але... „народ у нас дурны, халерны народ“. Па характары размовы відаць было, што навіны прышлі нядобрыя.

— Так ім і трэба,—азваўся Міхалапаў Савось, мужык панурага віду:—не разбурваць, а спаліць трэба было-б, а котлішча заараць. Вось яшчэ тырчыць ідал,—пры гэтым Савось паказаў на панскі дом:—бо калі хоць голыя сьцены астануцца, то й за іх чапляцца будуць. А так спаліць, зьнішчыць, то трасцу другі раз асталюецца. Народ у нас яшчэ дурны.

На гэты час пад‘яжджала хурманка, якую заўважыў дзед Патап за возерам. На возе сядзеў Пілiп Хамуток з Вялікіх Крукоў.

Колькі сялян падышло да Піліпа, бо адразу відаць было па Піліпу, што ён мае сказаць нешта цікавае.

— А што ён кажа?—запытаў дзед Патап, бо яго старыя вушы крыху не дачувалі.

А Піліп казаў:

— І далей Рудаўца ўжо ехаць нельга: зараз-жа за Рудаўцам пачынаюцца позыцыі: войска—поўнае сяло, чырвоная гвардыя стаіць. Каля Харланаўкі дзьве батарэі пастаўлены. Такая, брат, суматоха, катавасія... Эх, заварваецца каша!

— А горад?

— Забраў! учора пад вечар немец увашоў!

— Горад забраў?—пачулася чыёсь трывожнае запытаньне.

— Бух! бух! бух!—адна за другою бухнулі тры гарматы лявей Рудаўца.

— Гурр!—адклікнулася ім яшчэ адна.

— Бум-бум!—грымела ў трэцім месцы.

— В-о-о-о!—працягнуў тонелька дзед Патап.

Усе раптам змоўклі і пабляднелі ад страху. Пiлiп Хамуток шпарка пагнаў свайго конiка, уцякаючы дальш ад вайны. За ім у здагон пусьцiлiся, заядла брэшучы, сабакi з двара крупарушнiка. Патрывожаныя сабакамі качкі мятнулiся ўбок. Громка загаргаталі на выгане гусi.

А сонейка сьвяцiла ласкава і лагодна на ясным небе.

II

Трывога і неспакой былі ў панскім доме. Першыя гукі гармат абудзiлi старую паню.

— Што гэта? Наташа, Наташа!—клiкала пакаёўку старая паня, абапёршыся локцем на пухавую падушку.

— Бум, бум, бум!—зноў загрымелi страшныя гарматы. Старыя сьцены панскага дома першы раз за сваё доўгае спакойнае жыцьцё здрыганулiся моцна, парывiста, і крэкнула размаляваная ў турэцкiм гусьце столь.

— Д-р-р-р!—жалобна забразгацела ў шыбах тонкае халоднае шкло, нiбы чагось плачучы.

Убегла пакаёўка, маладая стройная дзяўчына.

— Войска ў Рудаўцы стаiць, выбiваюць немца з гораду. Немец у горад вашоў. Ой, што-ж гэта будзе?—узбураная страхам казала дзяўчына.

— Божа мiласьцiвы, зьлiтуйся нада мною!—прастагнала старая паня.

Ёй страшна, страшна, старой панi. Яна пачула, што нейкiя варожыя сiлы нацiскаюцца з усiх бакоў, як-бы на яе наступала бурлiвае мора, каб зьмесьцi яе і пахаваць у цемры свайго бяздоньня.

Яна бачыла вакол сябе цёмны вiр, якi нямiнуча зацягне ў сябе яе жыцьцё. А здарэньнi апошнiх дзён, сьмерць яе сястры і нявесткi, якiя былi забiты ў сваiм маёнтку, яшчэ больш падкрэсьлiвалi думку аб чымсьцi страшным, грозным, неадхiльным. Кожны крык на вулiцы, кожная чалавечая фiгура веялi на яе подыхам сьмерцi.

Яна борзда адзелася, села на канапку і некалькі моманту сядзела нярухома, а кожны гарматны стрэл біў моцна па яе сэрцы.

Разам з гэтым і нейкая надзея часамі прабівалася ў яе душу. Яна думала аб немцах, думала аб іх ваяцкай выдатнасьці. Калісь, і ня вельмі даўно, яна шчыра жадала ім усякага ліха, лічыла іх разбойнікамі, катамі, ворагамі чалавецтва, якіх трэба зьнішчыць, пасадзіць на жалезны ланцуг. А цяпер гэтыя „каты“ ёй здаваліся збавіцелямі, і яна прасіла бога ў патайных мысьлях сваіх, каб яны, гэтыя немцы, хутчэй прышлі сюды... О, каб толькі прышлі!

А гарматы грымелі не на жарты.

Відаць, яны цьвёрда пастанавілі ня сьціхаць, покі вораг ня выйдзе назад з гораду. І сьцены панскага дому ўсё дрыжалі й дрыжалі, і жалобна зьвінелі ў вокнах шыбы. Страшна рабілася старой пані. Ніклі надзеі на прыход „збавіцеляў“.

— Наташа! Наташа!—зноў клікала пакаёўку старая паня.

— Бух! Бух!—грымелі ў адказ ёй гарматы.

— Грыша! Грыша!—звала яна ўнука.

— Гум!—раўла з другога месца гармата.

— Божа мой! я адна, хто заступіцца за мяне!

І яна борзда, наколькі магла, падышла да абраза, што вісеў у куце, і стала прад ім на калені. Прынікшы да зямлі лобам, яна некалькі мінут заставалася ў гэтай постаці.

Убегла пакаёўка, хацела штось сказаць, але запынілася, убачыўшы паню на каленях.

Цяжка ўздыхнуўшы, паднялася яна з кален і села ў мяккае крэсла, схіліўшы галаву.

— Скажы, Наташа, чаму людзі такія ліхія? За што забіваюць яны кабет? За што забілі яны маю сястру і нявестку, за што?.. Ох, і мяне яны заб‘юць!.. Чуе маё сэрца, заб‘юць яны мяне! Хіба ёсьць у іх кропля жаласьці?!. Дзіч, дзіч азьвярэлая!

Натальля панурая стаяла моўчкі. Яна хацела нешта сказаць, але не адважвалася.

— Ой, панечка, мілая, прамовіла яна, такі праўда азьвярэлі людзі. Што-ж я чула! Па сяле гутараць мужыкі, што

паноў усіх трэба перарэзаць. І паноў і папоў. Тады кажуць, і пачнецца самае настаяшчае жыцьцё, калі адны мужыкі застануцца. І нават мне самой казалі, каб я пакінула дом, бо каго захопяць у панскім доме, таму—каюк!

Паня, як аглушаная громам, асунулася на канапку. Яна пачула, як усё ў яе затраслося, стала горача, а потым усё ў яе анямела, пацямнела ў ваччу, а жыцьцё і ўвесь сьвет якбы адышлі кудысь далёка, і толькі адна сьветлая палоска адна толькі шчылінка, праз якую сьвяціўся дзень, засталася ад усяго, што называецца жыцьцём.

Адзервянела старая паня. Нават думкі спыніліся. Вочы яе напалову зачыніліся і перасталі міргаць, уставіўшыся ў нейкі пункт.

Перапалоханая Наташа ціха падышла да яе і кранула яе за руку.

— Пані!

Паня не паварушылася.

— Пані!

Яна паволі ўзьняла на дзяўчыну вочы і ціха прамовіла:

— Божа, як пуста і цесна на сьвеце!

І зноў змоўкла.

Пакаёўка пазірала на яе і ня ведала, што ёй рабіць.

Потым зноў, як-бы да самой сябе, казала паня:

— Мае дубочкі, слаўныя, мілыя дубы. Я была маленькаю, а яны былі, як вежы, і ніколечкі не зьмяніліся за мой век... Мяне ня будзе, а яны будуць стаяць тут яшчэ сотні год... Але не, не... пасьсякаюць і іх...

Зноў задумалася паня.

Натальля пужліва пазірала на старую.

— Ой, матачкі! Яна-ж, мусі быць, звар'яцела, бедная,— думала Натальля.

— Усё загіне, усё зьнішчыцца,—ціха да сябе самой казала паня. Яна зноў сьціхла, як-бы ўпаўшы ў нейкі сон.

— А Грыша дзе?

— Гу! Гу!—адказалі ёй гарматы.

Натальля паціхеньку вышла перад гэтым.

Грыша пры першых гуках гармат пабег у сад. Ён выбраў зацішнае месца ў густым вішняку, стаяў і слухаў, як бухалі гарматы і як адклікілася ім патрывожанае іх водгульлем поле з глыбокімі ярамі.

Гарматы стаялі дзесь блізка, вярсты чатыры—ня болей. Самая блізкая адгэтуль батарэя страляла тройкамі.

— Гух-гух-гух!—цяжка стагнала яна.

Крыху пачакаўшы, дзесь далей, гэтым тром стрэлам адклікаліся па чарзе другія тры стрэлы, але шмат глушэй, слабей і больш каротка.

— Ву!-ву!-ву!

Гэта былі выбухі снарадаў.

Было страшна, нязвычайна страшна, асабліва спачатку. Нейкая моц, грозная сіла ўрывалася ў душу і заглушала ў ёй яе звычайныя інтарэсы, і разам з гэтым знаходзілася ў ёй водгульле.

Грыша першы раз чуў так блізка гарматы і захапляўся іх грознаю музыкаю.

Грыша быў хлопец малады, гадоў восемнаццаці, прыгожы, высокага росту, крэпкага складу. Часова ён змушан быў пакінуць унівэрсытэт, ня хочучы заставацца ў стане немцаў. Немцы тады пагражалі Харкаву, дзе Грыша быў студэнтам. Ня так даўно ён прыехаў сюды да бабкі. Рэволюцыя моцна захапіла Грышу, і ён прымаў самы дзейны, самы жывы ў ёй удзел. Жывучы ў вёсцы, ён быў сакратаром і народу ня цураўся. На грунце захапленьня рэволюцыяй у яго нават былі непаразуменьні з сваякамі. І вось, калі нядаўна зябілі яго цётку і яшчэ адну сваячку збоку бабкі, то старая пані казала яму:

— Каму ты, Грыша, спрыяеш? ворагам сваім. Ну, каму, скажы, патрэбна сьмерць іх? Навошта гэта кроў?

Грыша маўчаў.

— Калі ты,—нападала на яго старая паня,—ідзеш з імі ў нагу, то ты і сам сукосна прымаеш удзел у гэтых забойствах.

— Ах, бабуня, калі находзіць навальніца, то яна не разь-

бірае, дзе палын горкі і дзе пшаніца. Такі ўжо яе закон. Рэволюцыя—тая-ж самая навальніца. Хто вінаваты? Ніхто і ўсе.

— Я не разумею цябе, Грыша,—кіпяцілася старая паня:— як можаш ты гаварыць так. Забілі бяз сэнсу, бяз усякае патрэбы яго бабку, цётку, а ён кажа: „Ніхто не вінаваты і ўсе вінаваты". І чаму ўсе? Тады й я ў гэтым вінавата?

— Так, бабуня, вінаваты й вы.

— Можа ты й вельмі адукаваны, але ў нашыя часы так не гаварылі студэнты,—прамовіла гнеўна бабка: — дагаварыцца да такой недарэчнасьці!

— Вось вы, бабуня, моліцеся богу...

— У тым і ўсё няшчасьце, што вы бога забылі,—перабіла ўнука старая паня.

— Бог за грахі аднаго раданачальніка клаў пракляцьце на ўвесь яго род, бабуня.

— Ты вырадак, Грыша. Значыць, будзе справядліва, калі і табе ў бок засуне вілы які-небудзь Міхалап ці які там Пракоп, з-за якіх ты так крыжуешся?

— Ня ведаю, бабуня, ці справядліва гэта, але што так можа ня стацца, то за гэта нельга паручыцца: усё можа быць.

Старая паня зірнула на ўнука, і сэрца яе пачула нейкую жаласьць. Каб прыпыніць гэту размову, яна пачала плакаць аб нябожчыках і аб самой сабе.

Грыша так захапіўся водгульлем недалёкага бою, што не заўважыў, як да яго падышла Натальля.

— Грыша,—з нязвычайнаю трывогаю ў голасе аклікнула яго дзяўчына.

Студэнт здрыгануўся, зірнуўшы на яе. Грыша быў моцна зражаны яе відам. Натальля была бледная, перапалоханая.

— Што з табою, Наташа?

— Уцякайце, хавайцеся, Грыша!

Студэнт яшчэ больш перапалохаўся. Ён нічога не разумеў і пужліва пазіраў на дзяўчыну, у яе ясныя вочы, у якіх адбіваўся страх і трывога.

— Уцякайце, уцякайце, Грыша, і чым хутчэй, тым ле-

пей, бо вас хочуць забіць.

Студэнт, пачуўшы апошнія словы, задрыжаў.

— За што-ж забіваць, Наташа?—апаўшым прарываным голасам, калоцячыся ад страху, прамовіў Грыша.

— Ну, я-ж сама чула. За вамі сачаць. Кажуць, вы нейкія знакі падаіцё немцам... Уцякайце!— ціха, у паўголаса казала Наташа і трасла студэнта за руку.

Грыша памяртвеў і стаяў, як-бы яго аглушылі абухам. Рукі й ногі яго трасьліся, сэрца заныла.

— Што-ж мне рабіць, Наташа?—як перапалоханае дзіця, пытаў студэнт, трымаючыся за руку дзяўчыны.

— Ідзеце куды-небудзь! Схавайцеся хоць на дзень, хоць на гэты момант. Пойдзем!

Натальля ўзяла яго за руку. Ён паслушна пашоў за ёю.

У гэты час на грэблю з горкі спускаліся тры коньнікі. Яны галопам праімчаліся па грэблі, падняліся на горку, праскакалі вуліцаю, каля яру й спыніліся на выгане, дзе стаяла сялянская грамада, якраз напроціў панскага дому. Коньнікі пазлазілі з сёдлаў.

— Таварышы!— зьвярнуўся адзін з іх да сялян:—нямецкая буржуазія прышла сюды для падтрыманьня расійскай буржуазіі. Яна хоча зьнішчыць нашу рабоча-сялянскую ўладу, вярнуць правы землеўласьнікам, каб на нашу шыю пасадзіць зноў пана. На Украіне ўлада перашла к царскаму гэнэралу Скарападзкаму пры дапамозе немцаў. Цяпер яны забралі наш горад. Калі мы пусьцім іх далей, то памятайце: за імі прыдзе пан, прыстаў, нагайка і вураднік. Паны зноў сядуць па сваіх маёнтках і будуць зноў заводзіць свае панскія старыя парадкі й законы, а за нарушэньне іх дваранскіх праў за іх разбураныя маёнткі будуць арыштоўваць вас і саджаць у вастрогі. Не дапусьцім-жа гэтага! Нам няма на каго спадзявацца. Мы самі павінны даць адпор нашым ворагам. Мы, сяляне і рабочыя, не дапусьцім паноў-дармаедаў. Далоў контр-рэволюцыю! Таварышы! Таварышы чырвонагвардыйцы стаяць на позыцыях з вінтоўкамі, гатовыя палажыць свае галовы за вас. Яны чакаюць ад вас падтрыманьня. Яны пры-

слалі нас к вам сказаць, што ім трэба дапамога. Таварышы! Наша ўлада, нашы правы ў нашых руках, але іх хочуць вырваць ад нас. Падтрымайце-ж нас у змаганьні з контррэволюцыяй, падтрымайце ўласную справу. Хіба-ж вы захочаце зноў стаць нявольнікамі й пакорна прасунеце шыю ў панскае ярмо. Хто ўмее страляць, а сярод вас ёсьць многа салдат, ідзеце ў нашы рады. Бярэце вінтоўкі, ідзеце на позыцыі, бо вораг—на парозе вашых хат! Далоў гвалтаўнікоў! Няхай жыве рабоча-сялянская ўлада!

Сярод сялян узбудзіўся нязвычайны рух, абурэньне. У іх вачох загарэўся агонь помсты, абудзілася стыхійная сіла, гатовая зьнесьці ўсё з дарогі.

— Даць помач!—крыкнуў хтось з грамады.

— Даць! Даць!—пранеслася бура галасоў.

— Хто йдзе—станавіся сюды!—заглушаючы шум натоўпу крыкнуў Ільлюха Бліноў, і сам выскачыў на прагал. У нямецкаю вайну ён камандваў узводам і быў заслужаным старшым унцер-афіцэрам.

— Рота, ка мне!—крыкнуў ён зноў, як ротны камандзір, і расставіў рукі, даючы знак, каб рота зьбіралася.

Адзін за другім, а то й цэлаю грамадою павалілі да яго ахвотнікі. Праз мінуту ваяк набралася на паўроты.

Мобілізацыя прашла борзда!

— Дзякую вам, таварышы,—кланяўся ім прамоўца.

— І паніча забраць з сабою! Няхай пакажа на дзеле, а не языком, што ён за народ стаіць.

— Забраць, забраць!—загрымелі ваякі.

III

Другая вестка ў доме старой пані згусьціла яшчэ больш і без таго згушчаны страх.

Чуць толькі вашоў Грыша з Наташай у дом, не пасьпеўшы нават абсудзіць з бабкаю, што рабіць, як з суседняе вёскі, дзе жыў іх сваяк, адстаўны ротмістр, ім далі знаць, што два дні таму назад быў забіты родны дзядзька Грышы, брат яго мацеры.

— Божая кара навісла над нашым домам,—бледная, як сьмерць, сказала старая паня:—о, божа, божа,—стагнала яна і ламала рукі.

І Грыша быў, як труп. Гэтая вестка яшчэ больш падкрэсьлівала няпэўнасьць цяперашняга часу, і тая небясьпека, якая пагражала яго ўласнаму жыцьцю, станавілася больш значнаю, больш рэальнаю. Свайго дзядзьку, Сяргея, Грыша вельмі добра помніў і любіў яго. Дзядзя Сяргей быў земскім доктарам, любіў просты люд і служыў яму чэсна.

Праўда, забілі яго зусім выпадкова. Гэтая сьмерць зрабіла цяжкае ўражаньне на Грышу. І калі сьпярша ён не згаджаўся сыйсьці адгэтуль на некаторы час і схавацца, то цяпер у яго было адно толькі жаданьне, адна думка: уцякаць, уцякаць у што-бы то ні стала.

На скорую руку ён адзеўся, захапіў ручны чэмаданчык, некалькі кніг на дарогу і, разьвітаўшыся з бабкаю, пакіраваўся ў сад другім ходам. Натальля йшла за ім, праводзячы яго з дому. Студэнт на момант прыпыніўся, глянуў на Натальлю.

— Ну, Наташа, прашчай!

Узяў яе за руку, паглядзеў ёй у вочы.

— Добрае тваё сэрца, Наташа! Ня ведаю чаму, але мне так шкода цябе, як нікога на сьвеце. Я гляджу на цябе, як на сястру!

І крэпка пацалаваў яе руку.

Дзяўчына ад нечаканасьці зусім замяшалася. Твар яе заліўся яркім румянцам. Потым яна заплакала, ці ад таго, што ён пацалаваў ёй руку, ці шкода стала хлопца, ці з другой прычыны. А ён ужо сходзіў з балькону ў сад.

У гэты час падыходзілі трое самамобілізаваных сялян. Двое другіх стаялі за кустамі язьміну, на тэй дарожцы, па якой трэба было прайсьці студэнту. Яны вышлі яму насустрэч. Гэта былі яго знаёмыя хлопцы, з якімі ён хадзіў на сходкі. Але цяпер яны былі зусім не такія, якімі ён іх ведаў звычайна.

Сур‘ёзна і дзелавіта аб‘явілі яму волю народу і вярнулі яго назад. У панскім доме спаткалі яшчэ трох дзяцюкоў і

ўшасьцярых вышлі на вуліцу. Там іх чакала цэлая грамада людзей, гатовых ісьці на позыцыі.

Грышу паказалася, што на яго зірнулі варожа і падазронна. На душы ў яго было цяжка, усё роўна як-бы вялі яго на сьмерць.

— Ну, айда!—скамандваў Ільлюха.

— Сьмерць буржуям!

— Далоў контр-рэволюцыю!

Шэрая маса заварушылася і пацягнулася, падымаючы пыл, у бок возера. Хтось успомніў старую салдацкую песьню:

Дружно, ребята, в поход собирайся,
Бери сухарей и белья для себя.

— Добра, дзеткі, задайце немцу, каб помнілі акаянныя!— казаў дзед Патап, праводзячы ваяк.

Мінулі грэблю, падняліся на ўзгорак. Уперадзе, крыху лявей, стаяў лясок, пераважна дубовы. Ён быў яшчэ бяз лісьця, толькі кустоўнік дзе-ні-дзе пачынаў выпускаць сьвежую зелень.

Сонца стаяла ўжо на поўдзені. З узгорку былі добра відаць далёкія і блізкія вёскі, вежы цэркваў і цэлыя рады ветракоў. У прыродзе было так слаўна. З кожнае лапінкі зямлі прабівалася новае жыцьцё, ціхае, лагоднае.

Прыветна пазіралі многадумныя сьветлавата-сінія далі, адзінокія ракіты, раскіданыя там-сям па дарозе. А сама гэта дарога! Мілая, слаўная! Яна бегла кудысь далёка адгэтуль і клікала з сабою ў новыя спакойныя краіны, дзе няма гэтае буры сьмерці, дзе ня чутно грому гармат.

Грыша йшоў маўклівы, пануры, адчуваючы страшнае адзіноцтва. Колькі раз азірнуўся назад, украдкай, як злодзей. Іх пасада, роўная дарожка, высаджаная ліпамі, высокія многавяковыя дубы пазіралі, як здавалася студэнту, тужліва і ўспагадна. А людзі, што йшлі з ім поруч, цяпер уяўляліся яму чужымі, варожымі. Яму страшна было ў кампаніі з імі.

А што, калі яны вывядуць яго ў гэты лясок і застрэляць? Хіба гэта для іх трудна? Забілі-ж яго дзядзьку.

Яшчэ большая адзінота агортвала яго душу. Чым бліжэй падыходзіў ён да позыцый, тым мацней уладала ім думка адстаць, схавацца і ўцячы.

Яму было вельмі няпрыемна, і ён сабе гэта тлумачыў, як нядобры знак, што яго намеры выйсьці з дому незаметна скончыліся няўдала. Яшчэ добра тое, што ён знашоў што адказаць, калі запыталі яго, куды ён выбраўся. А ён сказаў, што йдзе на позыцыі сам па добрай волі, каб рабіць раненым перавязкі. У вёсцы ведалі, што ён вучыцца на доктара, і такі яго адказ здаволіў і запакоіў найбольш заядлых непрыяцеляў.

Тымчасам людзкая грамада павярнула з дарогі ў бок лесу. Каля саменькага лесу павівалася вузенькая, адпачыўшая за зіму ад людзкіх ног, сьцежачка. Вярсты паўтары бегла яна поруч з лесам, каб потым абагнуць другі яго край і зараз-жа спусьціцца ў глыбозны і шырачэзны яр, густа заросшы дубняком, дзікімі грушамі й хмелем.

Грыша прагным поглядам азіраў гэты яр і абмяркоўваў плян уцяканьня. Баязьліва і скоса кідаў вачамі на грамаду. Яму здавалася, што яна чытае ў ім патаемныя думкі яго. Але, калі ня зробіць ён гэтага тут, то там, на чыстым полі, за ярам, ужо гэтага ніяк ня зробіш: там чужое сяло, там войска і строгі надзор за кожным. Толькі ў гэтым яры зьбегчы: ён цягнецца на дзесяткі вёрст і злучаецца з цэлаю сеткаю другіх яроў.

Лясок ужо заставаўся ззаду. Цяпер сьцежачка ішла па касагоры, спускаючыся ў яр. Па другі бок яру ужо відаць былі ветракі Рудаўца. Дзесь збоку ад вёскі яшчэ больш драпежна бухалі гарматы. Сяляне-салдаты прыціхлі і сталі сур'ёзны. Грыша пазіраў на іх і дзівіўся: іх ніхто ня гнаў, яны пашлі самі; што-ж прымушала іх пайсьці? Сьвядомасьць доўгу? Свае асабовыя інтарэсы? Ён ніяк ня мог зразумець гэтага і пачуваўся тут лішнім і непатрэбным. Ён чуў, што на яго насунулася нейкая навала, гатовая сьцерці яго, як лёгкую пылінку.

Як толькі спусьціліся ў яр, ён зараз-ж азірнуўся, як профэсыянальны злодзей, зірнуў на салдат, зьмерыў вокам

кусты (цяпер ён быў апошнім, за ім нікога ня было), прыгнуўся і шуснуў у яр, у кусты, прабег колькі крокаў, стараючыся не рабіць шуму, забіраючы ў гушчар і кіруючыся ў тое месца, дзе яр разгаліньваўся на многа яроў. Тут ён прыпыніўся і прыслухаўся. Нікога ня было. Толькі гарматы з кароткімі перарывамі бухалі і бухалі, пасылаючы ў горад снарады, ды дзесь правей вёскі тахкалі куляметы.

І ўсё-ж самапачуваньне ў Грышы было няпрыемнае, бо ён выяўна цяпер стаў на шлях зрады. Нейкае нутраное пачуцьцё падказвала яму, што ён зрабіў нядобра. Нават быў такі момант, калі ён хацеў вярнуцца, каб далучыцца да сялян, але ня мог перамагчы ў сабе нейкага страху. Гэтая вайна, гэтая кроў, зьнішчэньне жывых форм жыцьця—навошта ўсё гэта? І яму, як ніколі, захацелася жыць, і ніколі такім мілым не здавалася гэта жыцьцё, як цяпер. Туляючыся між кустоў, як злодзей, як воўк, ён ішоў усё далей і далей. А гэта страшнае месца з кожным крокам кудысь адыходзіла і заціхала. Што-ж рабіць цяпер?

Трэба прабіцца да блізшае станцыі і калі ня можна вярнуцца ў Харкаў, то паехаць у які-небудзь горад, хоць-бы і ў Курск. Яшчэ з паўвярсты прашоў ярам, агібаючы вялікім крукам сваю вёску.

Прыпыніўся, прыслухаўся. Было ціха. Толькі гарматы, бухаючы глушэй і далей, надаедна напаміналі яму аб тым, што ён ухіліўся ад агульна-грамадзкай справы, што карцела яму нейкім бясслоўным дакорам.

Асьцярожна прабіраючыся па сухіх леташніх лісьцях між разгатых кустоў, Грыша папрабаваў падняцца ўгару па схіле яру, каб выйсьці наверх, бо й туляцца ўвесь час у яры таксама небясьпечна: лёгка можа паказацца, што ён асоба падазрэнная. Вышаў. Перад ім ляжала пустое поле. Недалёка ад яру бегла дарога, то падымаючыся на ўзгоркі, то хаваючыся ў лагчынках. Крыху паразважаў. Хацеў ужо пакіравацца на дарогу, аж зірк—на горку падымалася група коньнікаў. То быў разьезд. Грыша кулём пакаціўся ў яр. Ён моцна перапалохаўся і толькі тады пачуўся спакайней,

калі шырокім кругам абагнуў сяло Малыя Крукі і вышаў на Рыльскі шлях. Вось толькі абмінуць Вялікія Крукі, што стаялі ў пяці вярстах ад яго вёскі. Але абмінуць гэта сяло было ня так лёгка: тут па адзін і па другі бок ляжалі шырокія балоціны, праз якія прайсьці было цяжка. Не даходзячы да сяла на тры чвэрці вярсты, Грыша спаткаў кабету. Разьмінуўся з ёю і, прашоўшы яшчэ дзесятак, другі крокаў, Грыша зьвярнуў з дарогі. Кабета, як толькі разьмінулася, прыпынілася і доўга ўзіралася ў незнаёмага паніча. Відаць, яе ўзялі нейкія падазрэнныя думкі. Яна шпарка павярнула назад, агародамі прашла ў двор. Грыша не заўважыў гэтага і таксама ішоў борзда, каб абыйсьці гэты кут і зноў выйсьці на дарогу, дзе, як яму думалася, ён будзе сьмел.

Ішоў ён і баяўся нават падняць вочы і азірнуцца. Вось зараз пройдзе палавіну небясьпечнае дарогі. Ён ішоў, прыгнуўшы галаву, і раптам здрыгануўся: два чалавекі вышлі з-за клуні і пазіралі на яго. Ён несьвядома прыбавіў ходу. Зірнуў яшчэ раз назад,—адзін чалавек махнуў рукою, даючы яму знак спыніцца. Грыша прыкінуўся, што не замеціў гэтага, а сэрца ў ім застукала мацней.

— Пастой! Пастой!—пачуў ён за сабою.

Грыша, не аглядаючыся назад, пусьціўся наўцекі.

За ім кінуліся і сяляне.

— Стой! Стой, ты, кажуць табе!

Хрыплыя галасы цяпер сталі бліжэй. Грыша, як зьвер, за якім робіцца пагоня, бег, нічога не разважаючы; адно ён толькі чуў, што скора павінна быць нейкая разьвязка Уперадзе на пярэймы беглі яшчэ трое сялян.

— Дзяржы яго, дзяржы!—гукалі ззаду.

Тры чалавекі перасякалі яму дарогу. Грыша выбіваўся з сілы, цяжка дыхаў, сэрца калацілася моцна.

Не дабягаючы сажняў пяць да пярэдніх, Грыша крута павярнуў у двор.

— Лаві! Ня пускай!

Высокі, рыжы, сярэдніх год мужык, загароджваў студэнту дарогу.

Грыша з разгону штурхануў рыжага.

Рыжы паляцеў убок на некалькі крокаў, але ў гэты-ж міг нешта вострае і цяжкае чарахнула Грышу ў галаву каля вуха. Грыша пачуў, як-бы яго апякло агнём. На твар і за каўнер палілася кроў. Ён зрабіў яшчэ колькі крокаў. Ногі яго аслабелі, і ён тварам упаў на зямлю, а вочы яго засланіся нейкім туманам.

Першы падбег да яго рыжы.

Высока ўскінуўшы дручок, рыжы з усяе сілы хваціў Грышу па сьпіне.

У захапленьні дзікага абурэньня рыжы крычаў:

— Бі шпіёна!..

Гэты крык як-бы прарваў нейкую заслону, якая агароджвае чалавека ад зьвера. Набегшы натоўп стаў біць студэнта, чым папала, мясіць і таптаць яго нагамі, бо тут ня было месца ні розуму, ні пачуцьцю чалавека.

Бледны, акрываўлены, зьбіты, у сінякох, Грыша ляжаў нярухома. І толькі цяпер, калі была ўжо праяўлена найбольшая зьвярыная жорсткасьць, пачыналі сям-там прыходзіць да памяці; у вогуле-ж натоўп быў настроен варожа. Нават дзеці-падросткі пацяшаліся відам акрываўленага незнаёмага хлопца і рабілі жорсткія увагі, і злыя ўсьмешкі крывілі ім губы.

І толькі цяпер, калі Грыша ўжо быў ком зьбітага мяса, пачуліся пытаньні:

— Хто-ж гэта такі? Чый ён?

Толькі цяпер пачалі развашаць, якая віна чалавека, якога з такім акамяненьнем нядаўна білі.

— Глядзі, глядзі, ён яшчэ жывы!

Грыша застагнаў і павярнуўся. Узьняўшы галаву, ён абвёў поглядам натоўп і ціха сказаў:

— Браткі, за што? Мяне яшчэ вылечаць, я яшчэ буду жыць. Не забівайце мяне!

— Стой, рабяты,—пачуўся чыйсьці ўладарны голас, і шырокія плечы, адціскаючы народ, паказаліся з натоўпу.

— Распытаць яго трэба харашэнька, ды паглядзець дакуманты,—казалі шырокія плечы.

— Ты хто такі ёсьць?

Грыша падняў памутнелыя, зацёкшыя крывёю вочы і сказаў:

— Студэнт Заплацінскі. Старая пані—мая бабка.

— А чаго ты прышоў сюды?

— Я йшоў на станцыю.

— А чаго ўцякау, калі табе казалі спыніцца?

— Баяўся...

— Баяўся,—працягнулі шырокія плечы:—значыць ёсьць прычына баяцца. Паказвай дакумант!

Колькі моманту Грыша стаяў, як-бы нічога не разумеючы.

— Дакумант твой дзе?—насядалі шырокія плечы. Грыша дзіка азірнуўся. Відаць, ён поглядам шукаў свой чэмоданчык, але яго тут ня было. Пачаў аглядаць кішэні. Рукі яго трасьліся, ногі не стаялі, падгібаліся. Ён асунуўся на зямлю і як-бы страціў прытомнасьць. Дакуманты ніяк не знаходзіліся.

— Якія там у шпіёна дакуманты!—крычаў хтось з натоўпу.

— Га, і дакумантаў няма!—зларадна крычаў рыжы.

Але дакумант знашоўся.

Разглядалі яго доўга.

— Чаму пячаць не на месцы?—прыдзіраўся чалавек з шырокімі плячамі.

Студэнт маўчаў; ён напэўна і ня чуў гэтага пытаньня.

— Вядзі яго, рабяты, на зборню.

Грышу паднялі. Хістаючыся, паплёўся ён, ледзь перастаўляючы ногі. Разам з ім зрушыў і натоўп.

— Браткі, родныя!—прасіўся Грыша:—што злога зрабіў я вам? Пусьцеце мяне!

— Там відаць будзе, што з табою рабіць.

Узышлі на горку. Недалёка стаяла царква, а каля яе быў роўны выган. На выгане таксама былі людзі. У ваднэй кучцы стаяў каваль Мамай і дзед Патап. Яны былі людзі набожныя і прышлі сюды ў царкву. Таксама мелася тут на увазе і коней сваіх дальш адвесьці на ўсякі выпадак. З натоўпу, які вёў Грышу, хтось аклікнуў каваля і дзеда Патапа.

Мамай і дзед Патап падышлі. Натоўп прыпыніўся.

— Ваш гэта „барчук"?—спыталі каваля.

Каваль паўглядаўся.

— Здаецца, як-бы наш,—адказаў каваль.

Промень надзеі асьвятліў душу студэнта.

— А, ты, стары, прызнаеш яго?

Дзед Патап кінуў на Грышу пануры погляд, крыху памяўся і цьвёрда прамовіў:

— Не, ня наш! Наш з рабятамі на немца пашоў.

Заныла сэрца ў Грышы.

— Дзядок, дзед Патап!—прамовіў ён:—нашто вы грэх на душу бярыцё? Хіба-ж вы ня ведаеце мяне? Дзед Патап! Дзядя Сьцяпан!—зварачваўся Грыша да сваіх сялян.

— Ня ведаю, ня ведаю цябе, хто ты ёсьць,—упарта казаў дзед Патап.

На бяду прыехаў разьезд. Колькі сялян гаварылі з ім, паказваючы на Грышу.

— Дзе ён?—пытаў начальнік разьезду, пад'яжджаючы бліжэй.

— А вось, ён самы.

Натоўп расступіўся. Грыша зірнуў у вочы начальніка разьезду.

Жорсткія, цьвёрдыя, бязжаласныя вочы.

— А, гэты!—прамовіў начальнік.

— Ну, хлопцы, злазь з коняй!

Пазлазілі.

— Ступай за намі!

Анямелы ад страху, бледны, як палатно, паплёўся Грыша з салдатамі. Ён быў пануры, маўклівы. Ні слова просьбы, ні слова жальбы. Чарада падросткаў і дзяцей пабегла за імі. Сярдзіта палайваючыся, туды-ж пасунуліся і мужчыны. Ззаду, стоячы на выгане, загаласілі дзьве ці тры кабеты. Шкода ім стала хлопца ці проста свой звычай, традыцыю выпаўнялі?

Мінуты праз дзьве схаваліся за горкаю. Яшчэ праз мінуту пачуліся ні то чатыры, ні то пяць стрэлаў...

Салдаты вярнуліся—Грышы з імі ўжо ня было.

Кр. К

ЗЬМЕСТ.